СОНЦА:
Усход, захад, даўжыня дня:
Мінск — 6.38, 18.03, 11.25;
Віцебск — 6.29, 17.52, 11.23;
Магілёў — 6.27, 17.52, 11.25;
Гомель — 6.22, 17.52, 11.51;
Гродна — 6.50, 18.20, 11.30;
Брэст — 6.52, 18.20, 11.28.

МЕСЯЦ:
Першая квадра 12 сакавіка.

ІМЯНІНЫ:
Парфірыя, Севасцьяна; Цыпрыяна, Бажыслава.

ЗВЯЗДА

10 САКАВІКА 1992 г.
аўторак, № 50 (21828)

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 50 кап.

ВОЗГАЛАС

Пастанова

Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

АБ ПЫТАННЯХ, ЗВЯЗАНЫХ З ПРАВЯДЗЕННЕМ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ

Прэзідыум Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь пастанаўляе:

1. Прыняць да ведама інфармацыю кіраўнікоў міністэрстваў і ведамстваў рэспублікі Мірачыцкага Ф. У., Шэпеля У. М., Сурмача В. В., Чыгіра М. М., намесніка старшыні праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь Сідарава У. А., намеснікаў старшынь аблвыканкомаў Гіруця М. І., Слесара У. М., Андрэйчанкі У. П., Яскевіча Г. С., службовых асоб аблвыканкомаў Русака А. В., Сухоцкага П. У. аб стане падрыхтоўкі да правядзення веснавых палявых работ.

2. Савету Міністраў:

распрацаваць і рэалізаваць неабходныя меры па неадкладнаму выпраўленню крытычнага эканамічнага становішча аграпрамысловага комплексу, маючы на ўвазе ў першачарговым парадку вырашыць пытанні забеспячэння эквівалентнага тавараабмену паміж сельскай гаспадаркай і прамысловасцю, як таго патрабуе Закон «Аб прыярытэтным сацыяльна-культурным і эканамічным развіцці вёскі і аграпрамысловага комплексу»;

унесці на разгляд 9-й сесіі Вярхоўнага Савета неабходныя прапановы аб устанаўленні льготнага падаткаабкладання і крэдытавання аграпрамысловага комплексу, а таксама аб расшырэнні паўнамоцтваў органаў выканаўчай улады ў забеспячэнні аператыўнасці кіравання эканамічнай і крэдытна-фінансавай палітыкай.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

3 сакавіка 1992 г. г. Мінск.

СЫРАВІНУ АТРЫМЛІВАЕМ, ПРАДУКЦЫЮ АДГРУЖАЕМ. А ГРОШАЙ — НЯМА

Эканамічнае становішча, якое складваецца сёння ў рэспубліках былога Саюза, як гавораць разумныя людзі, патрабуе нейкага тэрміновага вырашэння. Пакуль заклапочаныя спажыўцы ламаюць галовы над пытаннем, дзе, за што і як мага дзешавей нешта набыць, не менш азадачаныя вытворцы матэрыяльных даброт думаюць, як дамовіцца аб сыравіне, па якой цане рэалізаваць прадукцыю, каб не застацца ў пройгрышы. І гэтая чахарда, падобна, з кожным днём паціху набірае моцы. Аднак неяк жыць, трымацца на плаву трэба.

— Абстаноўка ў нас — як і на іншых прадпрыемствах горада, — гаворыць намеснік дырэктара па эканоміцы завода медпрэпаратаў Раман Куніцкі. — Няўмольна расце запазычанасць спажыўцоў нашай прадукцыі. Прычыны неплацежаздольнасці: цэны падскочылі ў 5 разоў, а аптэкі, якія рэалізуюць нашы прэпараты, прадаюць лекі толькі ў два разы даражэй. Трэба адзначыць, што з сыравінай, якую нам пастаўляюць з Расіі, Прыбалтыкі, Украіны, Арменіі, Азербайджана, сёння перабояў няма. Расійскія пастаўшчыкі, напрыклад, усе дагаворы выконваюць, як кажуць, на ўсе сто. Так што пакуль у нас атрымліваецца так: планы па аб'ёму вытворчасці выконваем, а грошай атрымаць не можам.

— Мы нават сёння знаходзім магчымасці для выпуску новых прэпаратаў, — гаворыць старшыня прафкома завода Святлана Клачок. — З грашамі цяжкасці ёсць, канешне. Але заработную плату рабочыя атрымліваюць своечасова. Скарачэнняў у нас пакуль таксама няма.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

«Пакідаем за сабой права...»

Ультыматыўным тонам вырашылі размаўляць з уладамі кіраўнікі 11 калгасаў і саўгасаў Кіраўскага раёна на чале са славутым старшынёй калгаса «Рассвет» імя К. П. Арлоўскага Васілём Старавойтавым. У адрас Магілёўскага аблвыканкома яны накіравалі петыцыю, у якой утрымліваецца пагроза спыніць продаж сельгаспрадукцыі дзяржаве, калі не будуць выкананы патрабаванні сходаў прадстаўнікоў у гаспадарках раёна. Так і сказана: «Пакідаем за сабой права...»

Сутнасць патрабаванняў ва ўстанаўленні парытэту ў абмене прадукцыі паміж вёскай і горадам, патрабуецца таксама права набыцця калектыўнымі гаспадаркамі дзяржаўнай уласнасці перапрацоўчых прадпрыемстваў. У прыватнасці, калгасы і саўгасы хочуць, каб яшчэ да прыняцця Закона аб прыватызацыі ім дазволілі купіць асноўныя вытворчыя сродкі Кіраўскага маслазавода.

Але, здаецца, ультыматумы зараз нічога не мяняюць.

Аляксандр САНЧУК.

Са старонак падручніка — у рэчаіснасць

БАБРУЙСК (В. Зіноўскі). З падручнікаў палітэканоміі і эканомікі мы ўжо ведаем такое слова, як лакаўт, што азначае масавае звальненне рабочых. На жаль, і гэта паняцце, якое мы раней прыпісвалі выключна Захаду, перайшло да нас разам з рынкам. Так, на Бабруйскім заводзе буйнагабарытных шын асацыяцыі «Белшына» ліквідуецца чацвёртая рабочая змена, а ў выніку ўсіх гэтых рэарганізацый намячаецца звольніць да 500 чалавек. Чым не лакаўт?

ЛЕТНІ ЧАС РАСІІ

«Летні» час уводзіцца на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі на перыяд з 29 сакавіка па 27 верасня 1992 года, паведамляе Дзяржстандарт Расіі.

У сувязі з гэтым стрэлкі гадзіннікаў на ўсёй тэрыторыі Расійскай Федэрацыі ў 2 гадзіны 29 сакавіка пераводзяцца на адну гадзіну наперад.

Аб цяжкім становішчы, у якім апынулася медыцынскае абслугоўванне, ведае, бадай, кожны. Татальны дэфіцыт ад сучаснай апаратуры і лекаў да бялізны і пасуды плюс нізкая заработная плата ўрачоў і абслуговага персаналу — вось асноўныя штрыхі да партрэта сёняшняй айчыннай аховы здароўя.

У гэтым плане хірургічнае аддзяленне 3-й гарадской бальніцы Мінска не з'яўляецца выключэннем. Толькі высокі прафесіяналізм, добрасумленнасць і міласэрнасць працуючых тут людзей дазваляюць ім і ў гэтых умовах сумленна выконваць свой абавязак. Немалая заслуга тут і загадчыка аддзялення Мікалая Фёдаравіча Сіўца. Хірург, як гаворыцца, «ад Бога», ён яшчэ і энергічны арганізатар.

На думку М. Ф. Сіўца і яго калег, выйсце са становішча ў разнастайных формах аховы здароўя і, у прыватнасці, страхавой як прыярытэтнай.

НА ЗДЫМКАХ: загадчык хірургічнага аддзялення Мікалай СІВЕЦ; ідзе аперацыя; аперацыйная сястра Марына ПРЫГАЖАЕВА.

Фота Юрыя БОНДАРАВА.

ШТО АДБЫВАЕЦЦА Ў ШКОЛЕ?

Мяркуючы па апошніх фактах учынення злачынстваў, школьнікі ў перапынку паміж урокамі па гісторыі і працы ў некаторых школах праходзяць...

Па-першае, кароткі курс рэкету. Вось свежы прыклад. У Гродна супрацоўнікамі міліцыі па вуліцы Леніна затрыманы старшакласнік адной з гарадскіх школ, які на працягу двух тыдняў вымагаў у другога школьніка 4,5 тысячы рублёў. І небеспаспхова, паколькі ўзяты юны рэкецір з доказамі злачынства — у момант атрымання патрабуемай сумы.

Па-другое, кароткі курс спекуляцыі. У аднаго школьніка з Ліды, дарэчы, шасцікласніка, невядомы пад пагрозай адабраў 4 тысячы рублёў і дзве куртки. Пацярпеўшы звярнуўся ў міліцыю, аднак нялішне задумацца, адкуль у хлопца ў кішэні 4 тысячы рублёў.

І па-трэцяе, вучань беспамылкова вызначаць у натоўпу землякоў іншаземца, разбіраецца ў марках замежных аўтамабіляў і трапляць у іх, калі гаспадары ненадоўга адлучаюцца. У Мінску побач з Камароўкай быў злоўлены такі юны «лазутчык», які забраўся ў «Паланез», што належаў польскім грамадзянам. Дарэчы, дзевяцікласнік К. быў, відаць, не ў ладах з фізкультурай — далёка ўцячы з 14-ю аўдыякасетамі і кафтарма джынсавымі спадніцамі пачынаючы злодзей не здолеў.

«Агенцтва РІД».

АБ АДКРЫЦЦІ ДЗЕВЯТАЙ СЕСІІ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ДВАНАЦЦАТАГА СКЛІКАННЯ

Адкрыццё дзевятай сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання адбудзецца 11 сакавіка 1992 года ў 10 гадзін раніцы ў зале пасяджэнняў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь у Доме ўрада.

ДА ВЕДАМА НАРОДНЫХ ДЭПУТАТАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Рэгістрацыя народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь, якія прыбылі на дзевятую сесію, будзе праводзіцца 10 сакавіка 1992 года з 9 гадзін да 20 гадзін у Доме ўрада (фае залы пасяджэнняў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь).

РЭФЕРЭНДУМ:

«Вярхоўны Савет вычарпаў сябе і павінен мужна прызнаць гэта»

На пытанні «Звязды» адказвае сакратар Камісіі па пытаннях галоснасці, сродкаў масавай інфармацыі і правоў чалавека Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, каардынатар апазіцыі Сяргей НАВУМЧЫК.

— Адной з галоўных тэм палітычных каментарыяў рэспубліканскіх газет становіцца цяпер магчымы рэферэндум аб датэрміновых парламенцкіх выбарах. Як вы ацэньваеце тое, што піша па гэтай праблеме наш друк?

— Не палічыце камплементам, але я б хацеў адзначыць даволі высокі ўзровень дыскусіі пра рэферэндум, якую вядзе цяпер «Звязда». У нас неяк усталяваўся і зрабіўся нормай абмен усялякага роду абвінавачваннямі, нават абразамі, пасля якіх пазіраеш на апанента з лютай нянавісцю. Гэта, дарэчы, тычыцца не толькі газетнай палемікі — самакрытычна павінен прызнаць, што і парламентарыі гэтым грашаць. Таму вельмі добра, што на старонках «Звязды» ідзе спрэчка менавіта аргументаў, доказаў — газета, здаецца, апраўдвае заяўленае калісьці імкненне зрабіцца газетай беларускай інтэлігенцыі. Між іншым, і дзяржаўным дзеячам, і палітыкам (як «правым», так і «левым») трэба навучыцца спакойна рэагаваць на крытычныя заўвагі ў свой адрас, без смяротных крыўд і абрывання рэдакцыйных тэлефонаў. На Захадзе ўвогуле журналіст лічыць абавязкам «прыперці да сценкі» палітыка пад час інтэрв'ю, — такая ўжо спецыфіка прафесіі. Таму прыкра за калег, калі пасля гадзіннай прэс-канферэнцыі Шушкевіч устае з-за стала з задаволеным выглядам — з яго павінен струменіцца пот. Як і з Пазьняка, ды і з любога іншага. Але, найперш мне здаецца, сіла ўдару — у валоданні тэмай — пад час жа прэс-канферэнцыі па выніках апошняй сустрэчы лідэраў СНД карэспандэнты шакіравалі якраз уласнымі манерамі і, выбачайце, нявыхаванасцю.

— Сродкі масавай інфармацыі перажываюць цяпер не лепшыя часы. Ваша камісія бачыць магчымы шлях таго, як захаваць наш друк, не пазбавіўшы яго пры гэтым свабоды?

— У лістападзе мінулага года па даручэнню апазіцыі мне давялося прадставіць канцэпцыю развіцця сродкаў масавай інфармацыі рэспублікі. В. Кебіч быў азнаёмлены з ёй і, наколькі я ведаю, пагадзіўся з асноўнымі палажэннямі. Нашы погляды супалі і з меркаваннямі новага міністра інфармацыі А. Бутэвіча, і цяпер ёсць шанц здзейсніць рэформы. Калі ў двух словах пра іх галоўныя мэты, то гэта — інтэграванне Беларусі ў сусветны інфармацыйны рынак, спрыянне развіццю незалежных выданняў, тэлерадыёкампаній і агенцтваў, прыярытэтныя ўмовы для беларускага кнігавыдання. Але найперш мы павінны прыняць Закон аб свабодзе друку — і такі праект ёсць, ён распрацаваны пад кіраўніцтвам Анатоля Вярцінскага.

— Днямі пачынаецца чарговая сесія Вярхоўнага Савета. З чым ідзе да яе парламенцкая апазіцыя?

— Ужо стала традыцыяй, што кожная новая сесія дае нейкія спадзяванні — бо чым далей, тым складаней робіцца жыццё, і многім здаецца: ну, вось цяпер ужо дэпутаты павінны ўзяцца за розум. Але ілюзіі развейваюцца ў першыя ж гадзіны, яшчэ пад час зацвярджэння павесткі дня.

Так, апазіцыі БНФ і цяпер ёсць з чым ісці на сесію — у прыватнасці, пад кіраўніцтвам Уладзіміра Заблоцкага распрацавана канцэпцыя эканамічнай рэформы, мы мяркуем зноў вынесці некаторыя законапраекты. Але радыкальныя рэформы магчымыя толькі, папершае, пры спрыяльным заканадаўчым рэжыме (а Вы ведаеце, якія законы прымае наш парламент) і, па-другое, калі іх будзе ажыццяўляць урад народнага даверу (не сакрэт, з каго складаецца наш урад).

Я не думаю, што Кебіч і урад пойдуць у адстаўку — за два гады Вярхоўны Савет ніколі па-сур'ёзнаму не спытаў з урада за яго дзейнасць. А нават калі б і пайшоў — гэты склад Вярхоўнага Савета ніколі не прызначыць дэмакратычных міністраў. Не той, як цяпер модна казаць, менталітэт.

Мы катастрафічна губляем час, і ў нас няма іншага выйсця, як рэферэндум і новыя выбары.

— Але ж і рэферэндум, і датэрміновыя выбары — зусім не таная справа. Не кажучы ўжо пра патрачаны час — на гэта пойдуць вялізныя грошы.

— Так, правядзенне рэферэндуму абыдзецца дзяржаве «ў капеечку», — калі не памыляюся, гаворка ідзе пра дзесяткі мільёнаў рублёў. Але чаму члены Прэзідыума не падлічылі, колькі каштавалі грамадству непрафесіяналізм дэпутатаў, іх, выбачайце, бязглуздыя ў шэрагу выпадкаў рашэнні? Калі б год назад аддалі людзям зямлю — сёння б прылаўкі крамаў мелі б зусім іншы выгляд. Калі б прынялі разумную сістэму падаткаабкладання — спад вытворчасці не набыў бы такія катастрафічныя тэмпы. Тут ужо лік ідзе не на мільённыя, а на мільярдныя страты. А што будзе далей? Вы перакананыя, што 11 сакавіка ў парламенцкую залу ўвойдуць людзі з кардынальна новым спосабам мыслення, што яны будуць здольныя працаваць канструктыўна? За два гады апазіцыя прапаноўвала дзесяткі заканадаўчых праектаў, і мы, здаецца, выкарыста-

(Заканчэнне на 3-й стар.).

«ЗА» І «СУПРАЦЬ»

Куды падацца?

У 1917 годзе вырашаць такое пытанне было лягчэй. Бедныя ішлі да чырвоных, багатыя — да белых. Многія ж не ўзялі ў рукі зброю і засталіся нейтралямі. Каб нейтралаў не было, магчыма, наш лёс быў бы больш шчаслівым. Сёння ў нейкім сэнсе гісторыя паўтараецца. Яна абавязвае грамадзяніна выказацца за рэферэндум ці супраць яго. А на рэферэндуме будзе вырашацца пытанне ўлады — галоўнае пытанне любой рэвалюцыі. Такім чынам, зноў нам прыйдзецца брацца за зброю, і наша шчасце, што такой зброяй з'явіцца звычайны аловак. Аднак, за што мы выкажамся і якую ролю адыграюць нейтралы — пытанне фактычна такой жа значнасці, як і ў 1917-м.

Думаю, усім зразумела, што пры дапамозе рэферэндуму робіцца спроба звергнуць вышэйшую прадстаўнічую і выканаўчую ўладу канстытуцыйным шляхам.

Становішчам у нашай дзяржаве незадаволены ўсе, але ці абавязкова менавіта сёння мяняць уладу? БНФ і шэраг партый выказаліся адназначна за рэферэндум, яны лічаць, што існуючы Вярхоўны Савет і ўрад праводзяць антынародную палітыку.

Старшыня Вярхоўнага Савета С. С. Шушкевіч — за правядзенне глыбінных рэформ існуючага Вярхоўнага Савета і ўрада, але, на жаль, Вярхоўны Савет не падтрымаў яго ў гэтым, прычым не было знойдзена інструментарыя гэтых змяненняў.

В. Ф. Кебіч — старшыня ўрада, заяўляе, што ён не баіцца страціць свой партфель, але лічыць, што новыя выбары могуць не даць вынікаў і мы трапім у патавае становішча, дзе выйгрышу ні ў кога не будзе, а ўзнікне безуладдзе — крах для ўсіх.

Прыводзіцца важкі аргумент. Ужо гады два ў Мінску не могуць выбраць некалькі дэпутатаў у Вярхоўны Савет. Тое, што сёняшнія выбаршчыкі не жадаюць галасаваць, характэрна не толькі для сталіцы.

16 лютага адбыліся выбары дэпутата ў Капыльскі гарадскі Савет. Заўсёды прымала ўдзел звыш 90 працэнтаў выбаршчыкаў, а цяпер — толькі 64. Тут ёсць над чым падумаць. І ўсё ж, якую пазіцыю заняць нам, куды, як гавораць, падацца, каб калі не нам, дык хоць бы нашым дзецям зажылося па-людску.

Я асабіста паважаю многіх лідэраў БНФ, згодзен з большасцю пунктаў іх праграмы, упэўнены, што існуючыя прадстаўнічыя і выканаўчыя ўлады зжылі сябе і патрабуецца іх неадкладная рэформа. Аднак насцярожвае, што ў гэтым руху ствараецца культ адной асобы, а ад любых культаў — мы ўжо гэта добра ведаем — прыходзіць вялікая бяда.

Разам з тым я лічу, што самым аўтарытэтным кіраўніком у сучаснай Беларусі з'яўляецца С. С. Шушкевіч, і ён сваёй пасадай у значнай меры абавязаны апазіцыі БНФ, больш таго, яго памяркоўная палітыка выклікае павагу не толькі грамадзян Беларусі, але і ў СНД, і ва ўсім свеце. Бадай, такая палітыка сёння для Беларусі найбольш абгрунтаваная, але хацелася б, каб памяркоўнасць С. С. Шушкевіча не прывяла да пакорлівасці.

Напрыклад, яго выказванне, што ён зробіць усё магчымае, каб пазбегнуць увядзення ўласнай валюты, прыводзіць да думкі — ці не з'яўляецца гэта вынікам знешняга націску. Сёння многія зразумелі, што без уласных грошай гаворка пра незалежнасць — блеф. У наш маленькі гарадок, я ведаю, з Украіны прыехалі тры чалавекі да сваякоў, толькі з адной мэтай — выкарыстаць прывезеныя «дрэўляныя» рублі.

А колькі іх пранікае ў Беларусь з усіх напрамкаў? Наша ўлада павінна ўмець вынікова абараняць інтарэсы свайго народа. Трэба прызнаць, што сёння яна гэта робіць вельмі дрэнна, баязліва, з агляданю. Напрыклад, купоны трэба было ўводзіць паўтара года назад, а цяпер — толькі шматразовыя ці наогул уласныя грошы. Далей, няма ніякай абароны простага працаўніка, сёняшняя прыватызацыя — звычайнае рабаўніцтва нацыянальнага багацця і асабістай уласнасці народа.

У якім лесе маланкова выгадаваліся мільянеры і чаму большасць народа стала бяднейшай у 10—15 разоў? Вывад. Іх сродкі, у тым ліку з дапамогай урада, незаконна перайшлі ў рукі прапежнікаў. Безумоўна, з такім урадам нам не па дарозе.

Аднак у той час, калі мы будзем праводзіць рэферэндум, затым выбары, а ўлады будуць бяздзейнічаць у чаканні адстаўкі, намечаныя сувязі з іншымі краінамі свету аслабнуць ці наогул парвуцца, узмацнее анархія, пачнецца яшчэ большы спад вытворчасці, што непазбежна прывядзе да выбуху, у выніку якога мы зноў трапім у кіпцюры жалезнай дыктатуры. Дзе ж для нас выйсце?

Яно, думаю, у тым, каб разумна спалучыць ідэі двух галоўных напрамкаў у сённяшняй палітыцы і пазбегнуць той канфрантацыі, якая непазбежна ўзнікне ў час рэферэндуму, дабіцца адзінства народа і яго палітычнай актыўнасці.

На першы погляд, гэта немагчыма. Але толькі на першы. Выканаць патрабаванне БНФ аб змене Вярхоўнага Савета і ўрада можна іншым шляхам. У экстрэмальныя ж моманты Вярхоўны Савет працуе нядрэнна. Трэба хутка прыняць Канстытуцыю і Закон аб выбарах на многапартыйнай аснове. Адразу правесці выбары народнага Сойму (500—600 чалавек), які са свайго складу зможа выбраць 150—160 чалавек у прафесіянальны Вярхоўны Савет, які будзе паступова мяняцца: адны будуць вылучацца, другія страчваць давер.

Вядома, што існуючы Вярхоўны Савет і яго старшыня набылі значны парламенцкі вопыт і добра было б яго выкарыстаць. Зрабіць гэта складана, але можна. На першы раз, каб пазбегнуць непатрэбнай барацьбы і ўлічваючы, што тэрмін сённяшняга Вярхоўнага Савета не вычарпаны, усе яго члены павінны стаць без выбараў дэпутатамі народнага Сойму. Безумоўна, самыя аўтарытэтныя і спрактыкаваныя будуць абраны народным Соймам у састаў Вярхоўнага Савета, які канстытуцыйным шляхам правядзе рэфармаванне ўрада.

Такім чынам, змогуць быць выкананымі патрабаванні многіх плыняў дэмакратычным шляхам без нагнятання міжусобіц, непатрэбнага абвастрэння барацьбы і на аснове аб'яднання народа. Пажадана, каб кожны грамадзянін Беларусі ўсвядоміў, што ад яго дзіцяці залежыць яго асабісты лёс і лёс яго Радзімы і не ўхіляўся ад грамадзянскага абавязку.

В. БАГДАНОВІЧ,
старшыня Капыльскага гарадскога Савета.

РЭФЕРЭНДУМ:

Аб праверцы прадпрыемстваў і арганізацый рэспублікі па пытаннях цэнаўтварэння

Ніжэйпрыведзены дакумент, — з разраду так званых афіцыяльных. Але гэта далёка не той афіцыёз, якім поўніліся газеты яшчэ не так даўно і ад якіх адварочваўся чытач. Думаецца, што гэты дакумент ён прачытае з асаблівай цікавасцю, справа, урэшце, датычыць яго ж кашалька...

Між іншым, прадбачым непазбежнае пытанне чытачоў: дзяржава вярнула ў казну па сутнасці нашы грошыкі, а непасрэдна нам ніхто ўжо не кампенсуе страт... На жаль, так. Хіба што суцешымся рэалюцыяй першага намесніка Старшыні Савета Міністраў Беларусі М. Мясніковіча ды думкай аб тым, што, можа, у сувязі з гэтай рэалюцыяй іншыя вытворцы добра падумаюць спачатку, перш чым ставіць на сваю прадукцыю цану.

Першаму намесніку Старшыні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь МЯСНІКОВІЧУ Міхаілу Уладзіміравічу

Дэпартамент эканамічнага кантролю, Галоўнае ўпраўленне цэн Дзяржэканомплана, Мінфін рэспублікі праверылі шэраг прадпрыемстваў і арганізацый рэспублікі па захаванню парадку фарміравання і прымянення цэн ва ўмовах іх лібералізацыі. У ходзе праверкі прааналізаваны прычыны рэзкага росту цэн, ускрыта шэраг недахопаў у цэнаўтварэнні.

Пры праверцы Мінскага мясакамбіната і Мінскага мясаперапрацоўчага завода ўстаноўлена, што пры фарміраванні свабодных адпускных цэн на гэтых прадпрыемствах неабгрунтавана ўключаны акцызны падатак на шэраг відаў мясапрадуктаў. **У выніку цана 1 кілаграма каўбасы «Сервелат» павялічана на 31 руб.** (цана 207 руб.), «Любіцельская» — на 26 руб. (189 руб.), «Святочная» — на 34 руб. (189 руб.), бужаніны — на 36 руб. (180 руб.), вэнджаніна «Кавалачкі» — на 35 руб. (165 руб.), языка ялавічнага — на 22 руб. (112 руб.).

Па выніках праверкі Дэпартамента неабгрунтавана атрыманая Мінскім мясаперапрацоўчым заводам выручка ад рэалізацыі мясапрадуктаў у **суме 130 тыс. руб. унесена ў бюджэт.** Будзе пералічаны ў бюджэт і незаконна атрыманы даход у суме больш 300 тыс. руб. з Мінскага мясакамбіната. Гэтым прадпрыемствам даручана сумесна з прадпрыемствамі гандлю пераглядзець цэны і ўстанавіць іх у адпаведнасці з дзеючым парадкам фарміравання.

Як паказаў аналіз, свабодныя рознічныя цэны на мясапрадукты застаюцца высокімі. На іх рост паўплываў шэраг фактараў. Напрыклад, цана аднаго кілаграма сыравэнджанай каўбасы «Савецкай» складала 234 рублі. Перш за ўсё высокая гандлёвая накідка, у разліку на 1 кілаграм каўбасы яна склала 48 руб. (25 працэнтаў да адпускной цаны). Адпускная цана прадпрыемства-вытворцы складае 187 руб. за адзін кілаграм, з якой 117 руб. (63 працэнты) прыпадае на кошт асноўнай сыравіны; 2,6 руб. (1,4 працэнта) — на затраты па вырабу каўбасы; 24 руб. (13 працэнтаў) — на прыбытак прадпрыемства; 43 руб. (23 працэнты) — на акцызны падатак.

Такім чынам, на прыбытак прадпрыемства, гандлёвую накідку магазіна і акцызны падатак прыпадае 115 руб. пры свабоднай рознічнай цане 234 руб. за 1 кілаграм.

Аналагічныя падыходы характэрны і пры фарміраванні рознічных цэн на іншыя віды высакаякасных мясапрадуктаў. У выніку цэны на іх застаюцца высокімі — каўбасы «Раўбіцкай» — 225 руб., «Сервелат» — 207, «Маскоўскай» — 202, вэнджаніны — 162—165 руб., рулета далікатэснага — 150, шыйкі «Мінскай» — 139, языка ялавічнага — 112 рублёў.

Рэзка ўзраслі цэны на вырабы дзіцячага асартыменту.

Праверка жодзінскай прамыслова-трыкатажнай фірмы «Світанак», якая спецыялізуецца на выпуску дзіцячых трыкатажных вырабаў паказала, што цэны на іх узраслі ў 5—10 разоў. Камплект вырабаў ясельнага ўзросту (да 2-х гадоў) прадаецца па 79 руб. 80 кап. (раней цана была 10 руб. 70 кап.), пазункі для дзяцей — па 32 руб. 25 кап. (раней 5 руб. 30 кап.), кофтачкі дзіцячыя — па 39 руб. 90 кап. (раней 5 руб. 10 кап.), камплект дзіцячы на ўзрост 2—3 гады — па 53 руб. 20 кап. (раней 5 руб. 15 кап.).

Аналіз паказаў, што такое рэзкае павышэнне цэн звязана са шматразовым павелічэннем кошту сыравіны і матэрыялаў, значным ростам заработнай платы, павелічэннем падаткаў і гандлёвай накідкі.

Узяць, напрыклад, камплект вырабаў ясельнага ўзросту. Яго цана — 79 руб. 80 кап. Да ўвядзення свабодных рознічных цэн гэты выраб для фірмы быў стратным. На кожным камплекце прадпрыемства несла страты ў 77 капеек.

Фірма «Світанак» адпускае гэты камплект гандлю па 60 рублёў (раней аптовая цана складала 7 руб.).

(Заканчэнне на 3-й стар.).

Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь

АБ ВЫВАЗЕ З РЭСПУБЛІКІ Ў 1992 ГОДЗЕ ПРАДУКЦЫІ Ў АБМЕН НА КАМПЛЕКТУЮЧЫЯ ВЫРАБЫ, ПАЎФАБРЫКАТЫ, СЫРАВІНУ І МАТЭРЫЯЛЫ ДЛЯ ПАТРЭБ ВЫТВОРЧАСЦІ

З мэтай выканання дзяржаўнага заказу, недапушчэння спынення прадпрыемстваў і аб'яднанняў, больш аператыўнага вырашэння пытанняў забеспячэння вытворчасці матэрыяльна-тэхнічнымі рэсурсамі Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Дазволіць прадпрыемствам (аб'яднанням), якія ажыццяўляюць пастаўкі па дзяржаўнаму заказу, праводзіць рэалізацыю выробленай імі прадукцыі вытворча-тэхнічнага прызначэння і нехарчовых тавараў народнага спажывання ў межах аб'ёмаў, пакідаемых у іх распараджэнні, або набытых матэрыяльных рэсурсаў спажыўцам рэспублік, што раней уваходзілі ў састаў СССР, у абмен на неабходныя гэтым прадпрыемствам (аб'яднанням) для выпуску прадукцыі камплектуючыя вырабы, паўфабрыкаты, сыравіну і матэрыялы пры незабяспечанасці імі вытворчасці ці неабходнасці замены аднаго віду матэрыялу на іншы без захавання ў гэтых выпадках парадку, прадугледжанага пунктам 3 дадатку 1 да пастановы Савета Міністраў БССР ад 6 лістапада 1990 г. № 275 (у рэдакцыі пастаноў Савета Міністраў БССР ад 16 жніўня 1991 г. № 320 і ад 18 верасня 1991 г. № 356).

Вываз за межы рэспублікі прадукцыі і тавараў ажыццяўляецца з дазволу кіраўніка прадпрыемства (аб'яднання)-вытворцы ці ўпаўнаважанай ім службовай асобы. У суправаджальных дакументах павінна быць паметка гэтых асоб аб дазволе на вываз з указаннем іх прозвішчаў і пасады, а таксама віду выпускаемай па дзяржаўнаму заказу прадукцыі, для якой робіцца абмен, і даты. Указаная паметка засведчваецца круглай пячаткай прадпрыемства (аб'яднання)-вытворцы.

Старшыня Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь В. КЕБІЧ.

Кіраўнік справаў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь М. КАЎКО.

3 сакавіка 1992 г. г. Мінск.

Палавіну патрэб беларускай сталіцы ў цеплаэнергіі забяспечвае Мінская ЦЭЦ-4.

Калектыў гэтага буйнейшага прадпрыемства гарантуе бесперабойную дзейнасць абсталявання, у рэжыме эканоміі паліва дасягнута вышэйшая прадукцыйнасць.

Поспех энергетыкаў у многім залежыць ад тых, хто нясе кругласутачную вахту каля шчытоў кіравання блокамі.

Сярод іх — вопытныя машыністы Іван РАБУШКА і Пётр КРАСІН.

Фота Я. ПЯСЕЦКАГА.

РЭХА ПУБЛІКАЦЫІ

«ГІСТОРЫЯ НЕ ЦЕРПІЦЬ ПЕРАКОСАЎ...»

АБАРАНІЦЬ БЕЛАРУСАЎ

Мы, выкладчыкі кафедры гісторыі і паліталогіі Мазырскага дзяржпедінстытута, лічым, што пісьмо групы вучоных, пісьменнікаў Рэспублікі Беларусь падымае надзённае пытанне, звязанае з гісторыяй узаемаадносін дзвюх суседніх і дружалюбных дзяржаў — Рэспублікі Беларусь і Рэспублікі Літва.

У цэлым выкладчыкі кафедры згодны з агульнай ацэнкай гісторыі ўзаемаадносін дзвюх дзяржаў, дадзенай у пісьме, у прыватнасці, з тым, што Віленскі край з'яўляецца спрадвеку славянскай (беларускай) тэрыторыяй, а горад Вільня (Вільнюс) — калыскай беларускай культуры. Насельніцтва гэтай тэрыторыі таксама ў асноўным беларусы.

Пастаноўка гэтага пытання садзейнічае павышэнню нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа, пачуцця гонару за сваю шматвяковую гісторыю.

Разам з тым, у характарыстыцы гістарычных падзей ёсць вельмі катэгарычныя заявы і недакладнасці ў ацэнцы гістарычных падзей: напрыклад, — Брэсцкага міру і Рыжскага мірнага дагавора.

Мы разумеем, што сёння ставіць пытанне аб вяртанні гэтых тэрыторый нашай рэспубліцы нерэальна. Аднак урад Рэспублікі Беларусь павінен больш рашуча абараняць правы беларусаў на тэрыторыях, якія ўваходзяць цяпер у Рэспубліку Літва, прысякаць спробы прэтэнзій на суседнія тэрыторыі з боку Літоўскай дзяржавы, на высокім узроўні спыніць прапагандысцкую агрэсію Літвы, якая выяўляецца ў публікацыі геаграфічных карт і паказвае беларускія землі як літоўскія.

Мы падтрымліваем прапанову аўтараў пісьма ў тым, каб пастаўленыя імі праблемы былі абмеркаваны на бліжэйшай сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

С. КАСЦЯН,
загадчык кафедры гісторыі і паліталогіі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт.

ЁСЦЬ ГОДНАСЦЬ І Ў НАС

Поўнасцю падтрымліваем зварот да Вярхоўнага Савета Беларусі, надрукаваны ў газеце «Звязда» ад 11 студзеня пад назвай «Гісторыя не церпіць перакосаў». Лічым, што складаная праблема Віленскага краю і горада Вільні патрабуе неадкладнага справядлівага вырашэння.

Мы перакананы, што бальшавіцка-летувісцкая акупацыя Віленшчыны, якая адбылася ў выніку ганебнай змовы кіраўніцтваў СССР і Летувы ў 1939 годзе, будзе канчаткова і поўнасцю асуджана сусветнай грамадскасцю. Лёс Віленшчыны будзе справядліва вырашаны мірным шляхам — шляхам перамоў і пагадненняў пад эгідай ААН.

Лічым неабходным звярнуць увагу ВС Беларусі на замоўчванне праблемы сродкамі масавай інфармацыі, на адсутнасць інфармацыі аб перамовах і на паспешнасць саміх перамоў, якія праводзяцца з летувісцкім кіраўніцтвам. Дасягнутыя пагадненні выклікаюць непакой. Ствараецца ўражанне, што лёс часткі нашай Бацькаўшчыны мала турбуе ўрад і ВС Рэспублікі, што Віленшчына ў чарговы раз будзе прададзена, цяпер ужо — ураду Ландсбергіса.

Таму вітаем адзіную беларускамоўную газету «Звязда», якая дала магчымасць аўтарам звароту асвяціць праблему, давесці да шырокай грамадскасці гісторыю яе ўзнікнення і, самае галоўнае, акрэсліць і ўказаць разумны шлях яе вырашэння.

Верым — сівая, шасцісотгадовая, адвечна славянская прыгажуня-Вільня стане і для сусветнай супольнасці Вільняй.

Верым — летувісты, нашчадкі слаўных жмудзінаў (жамойцаў), якія на працягу стагоддзяў па-брацку жылі з нашымі прашчурамі ў старажытнай беларускай дзяржаве — Вялікім Княстве Літоўскім, Рускім і Жамойцкім, з разуменнем адносіцца да нашых святых, гістарычна і юрыдычна абгрунтаваных памкненняў.

Верым — новая Віленшчына па-мацярынску злучыць і сагрэе людзей розных нацыянальнасцей — беларусаў, палякаў, летувісцаў, рускіх, яўрэяў, татараў і іншых.

Ёсць годнасць у летувістаў. Ёсць годнасць, ёсць памяць і ў нас — грамадзян Беларусі. За гэта мы паважаем нашага суседа, за гэта, спадзяёмся, і ён паважае і будзе паважаць нас.

Лічым неабходным заявіць, што Вярхоўны Савет і ўрад Беларусі абавязаны накіраваць у Арганізацыю Аб'яднаных Нацый поўнае, аб'ектыўнае абгрунтаванне і просьбу-заяву аб пастаноўцы пытання перадачы Віленшчыны разам са слаўнай Вільняй пад юрысдыкцыю Рэспублікі Беларусь. Нельга гандляваць Бацькаўшчынай і сумленнем!

У. ПАЎЛОВІЧ,
старшы навуковы супрацоўнік Інстытута фізікі АНБ;
У. БЕЛЫ,
вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута фізікі АНБ;
Г. МАЛАШКЕВІЧ,
старшы навуковы супрацоўнік Інстытута фізікі АНБ і іншыя (усяго 19 подпісаў).

ХОПІЦЬ ГАНДЛЯВАЦЬ РАДЗІМАЙ!

Я падтрымліваю аўтараў артыкула ў вашай газеце ад 11 студзеня бягучага года «Гісторыя не церпіць перакосаў» і патрабую ад дэпутатаў нашага парламента прызнаць незаконнымі акты ўрадаў Савецкай Расіі, СССР і Літвы 20-х і 40-х гадоў аб перадачы Вільні і Віленскага краю Літве, дэнансаваць гэты дагавор і вярнуць нашы беларускія землі нашай рэспубліцы.

Я заклікаю ўсіх беларусаў-патрыётаў падтрымаць гэты заклік і катэгарычна патрабаваць ад беларускага парламента давесці справу да канца. Хопіць гандляваць беларускімі землямі!

Д. САМУЙЛАЎ.
г. Дуброўна.

ЗАСТУПІЦЦА ЗА СЯБЕ

Лічу, што аўтары артыкула цалкам маюць рацыю: мы, г. зн. Беларусь, павінны заступіцца за сябе, ставіць пытанне наконт Вільні і Віленскага краю ажно пакуль наша гістарычная сталіца не з'яднаецца з маці-Айчынаю.

Ствараецца ўражанне, што вышнія ўлады Беларусі аніяк не дбаюць ні пра гонар нацыі, ні пра сапраўдную незалежнасць. Да іх яшчэ не дайшло, што месца, дзе рэалізуецца Беларусь, — гэта не СССР, не СНД, а толькі сама Беларусь.

Мікола БУСЕЛ.
Светлагорскі раён, в. Дуброва.

ПРАБЛЕМУ ТРЭБА ВЫРАШАЦЬ

Апошнім часам новыя беларускія дзеячы абвяшчаюць з камуністычным размахам, што землі беларусаў, якія адміністрацыйна аказаліся ў гаспадарствах другіх народаў, яны аддаюць безагаворачна.

Ёсць пастанова былога Вярхоўнага Савета БССР аб тэрытарыяльных пытаннях у дачыненні да Летувы. Але чамусьці і цяпер, калі сітуацыя змянілася ў лепшы бок, таварышы загаманілі зусім інакш. Што стаіць за гэтым — абыякавасць да лёсу беларусаў, жаданне камуністаў і ветэранаў забыць гэты ганебны ўчынак, калі расеец П. Панамарэнка пры іх маўчанні аддаваў землі беларусаў іншым народам, гістарычная і маральная неадукаванасць нашых дзеячаў?

Прадстаўнікі ўлады абвяшчаюць, што аддаюць за так і лічаць, што перамовы весці не патрэбна. А можа, тая ж Летува гатова вярнуць нам Вільню і Віленскі край, ці хоць частку гэтых зямель?

В. Ландсбергіс калісьці прапаноўваў вярнуць Японіі Курыльскія астравы. Невядома, чым ён кіраваўся — звычайным пачуццём справядлівасці ці гаварыла ў ім камуністычнае выхаванне — раздзяляць і аддаваць другім тое, што яму не належыць?

Мы ведаем, што многія людзі, прыдбаўшы знаходку, на якую яны не маюць правоў, няўтульна сябе адчуваюць. Можа, так і летувісты адчуваюць і з імі можна дамовіцца?!

Урады Летувы і Расіі не прызнаюць пакт Молатава—Рыбентропа, не прызнае яго ЗША і Еўропа. Значыць, мы, беларусы, павінны выступаць як гаспадары гэтых зямель, як паўнапраўныя партнёры на перагаворах.

Канешне, цяперашняя этнаграфічная сітуацыя не на нашу карысць. Але ж яна і не на карысць летувістам.

Абвяшчаць, што праблемы не існуе, — гэта значыць пакінуць у знявазе і ўсе будучыя пакаленні беларусаў. Мала ёсць у свеце народаў, якія гублялі б сваю 600-гадовую сталіцу. Тыя ж яўрэі праз тысячагоддзі вярнулі свае землі і сталіцу, хоць і не ўсю. А тут прайшло 50 год, і ўвесь свет прызнаў, што землі перайшлі да Летувы ў выніку злачыннага зговару другіх народаў, і мы згаджаемся.

Згуба будзе пастаянна напамінаць нядобрым словам кіраўніцтву расейцаў, якія расплаціліся нашай сталіцай, каб Летува 50 год пабыла ў Саюзе.

На карце БССР раней і цяпер абведзены лініяй некалькі вёсак і стрэлачкамі паказана, што гэта Летува і Расея. От, бачыце, якая далікатнасць — беларусаў перасялілі з Браншчыны ў Гомельскую вобласць і абвясцілі, што гэта РСФСР, а што Вільня — сталіца беларусаў і што беларусы жывуць вакол Вільні і нават пад Каўнасам, усе забываюць.

Я лічу, што нашаму кіраўніцтву трэба сур'ёзна заняцца абаронай годнасці і інтарэсаў беларусаў мірным — паўтараю — мірным, цывілізаваным шляхам.

Гэта, па-першае, двухбаковыя перамовы. І аб іх павінны ведаць беларусы. Досыць сакрэтаў! Калі перагаворы не дадуць вынікаў, то трэба звяртацца ў Еўрапейскі суд у Гаазе, у ААН, апеляваць да еўрапейскай грамадскасці.

Рашэнне гэтай праблемы я бачу наступнае. Вільня і Віленскі край павінны быць падзелены. Новыя раёны Вільні, якія будаваліся летувістамі, павінны адысці да Летувы. Гістарычным цэнтрам беларусы і летувісты павінны валодаць сумесна. Нам павінен адысці раён Старой Вільні, якая заселена беларусамі, і яны будуць клапаціцца аб нашай гісторыі, аб цэрквах і касцёлах, аб нашых святых, аб магілах нашых продкаў. Да Старой Вільні павінна прымыкаць частка Віленскага краю, дзе мы ў будучым адбудуем Новую Вільню.

Гэтым будзе знята знявага з беларусаў, як з народа, у якога нават сталіцу забралі.

Аркадзь БЛІНКОЎСКІ.
г. Баранавічы.

СПРЫЯЦЬ АДРАДЖЭННЮ

11 студзеня ў газеце з'явіўся артыкул «Гісторыя не церпіць перакосаў». Згодна з артыкулам, а раней—заявай Дземянцея, Беларусь павінна вырашыць сваю памежную праблему. Сапраўды, калі мы былі ў Саюзе, яе ніхто не ўздымаў. Калі Беларусь стала ствараць сваю дзяржаўнасць, яна не стала замоўчвацца. Цяпер падкідваецца нават ідэя, што літоўцы будуць адраджаць беларускую мову, культуру, звычаі і вырашаць усе задачы тутэйшага насельніцтва. Толькі мы не верым, каб за нас усё вырашалі нашы суседзі. У Беларусі і Віленскім краі яшчэ не ўсвядомілі, што мы — карані аднаго народа, толькі падфарбаваныя каталіцкай і праваслаўнай рэлігіямі, якія зусім не збіраюцца адраджаць нашу дзяржаўнасць, нашу беларушчыну. І з мяне было дастаткова, калі на Аршаншчыне праваслаўны свяшчэннік, у час вылучэння кандыдатаў у дэпутаты, гучна заявіў: «У нас павінна быць усё або польскае, або рускае». Зараз дабавім уніяцтва, якое скажа: «У нас павінна быць усё ўкраінскае».

А тое, што Вільня павінна быць у Беларусі, сумнення не выклікае, гэта сапраўды яе галава, а без галавы астатнія часткі цела не дзейнічаюць. І калі зараз запалохваюць нас другім Карабахам, то трэба сесці за стол перагавораў і вырашыць цывілізавана гэту праблему. А гісторыкам і кампетэнтным асобам трэба даказаць Літве, што «пагадненні стагоддзя» былі незаконнымі, за спінай беларусаў, падняць дагаворы Сталіна з Літвой і астатнімі, а не рабіць выгляд, закрыўшы вочы і набраўшы ў рот вады, што нічога не адбылося. Яны акупацыю савецкімі войскамі не прызналі, а чаму мы павінны прызнаць і ўзаконьваць акупацыю нашых зямель Літвой, Латвіяй або Польшчай? Адраджэнне Беларусі немагчыма без яе састаўных частак.

Ф. ВАЙЦЯХОВІЧ.
г. Орша.

ЗАМЕСТ ПАСЛЯСЛОЎЯ

Гэтыя пісьмы прыйшлі ў рэдакцыю літаральна на працягу аднаго тыдня. Шчыра кажучы, некалькі ўразіла аднадушнасць аўтараў, іх цвёрдасць і перакананасць у сваіх доводах і аргументах. І мы вырашылі надрукаваць допісы без рэдагавання, далёка не зусім згаджаючыся з іх аўтарамі...

Разумеем: абмеркаванне лёсу спрадвечных беларускіх земляў — тэма «балючая», тонкая і далікатная, і вырашаць праблему трэба тактоўна, з улікам усіх абставін, без эмацыянальных перахлёстаў. Але ж яна — хоць і далёка неадназначная — рэальная. І, так бы мовіць, адмахнуцца ад яе, закрыць вочы на існаванне праблемы (чым, дарэчы, усе мы «вызначаліся» яшчэ так нядаўна), значыць, прадэманстраваць і пагарду да гісторыі і лёсу сваёй Бацькаўшчыны, і абыякавасць, і звычайную некампетэнтнасць і недасведчанасць... Больш таго, гэта будзе проста несумленна: рана ці позна пытанне ўсё роўна паўстане, рана ці позна на яго трэба будзе шукаць той ці іншы адказ.

Акрамя допісу «Гісторыя не церпіць перакосаў» («Звязда» за 11 студзеня гэтага года), сярод аўтараў якога, нагадаем, акадэмік Р. Гарэцкі, пісьменнікі М. Лужанін, Б. Сачанка, Я. Лецка, М. Ермаловіч, А. Ліс, гісторыкі В. Цітоў, С. Цярохін, В. Сіўчык, газета дала таксама слова і прафесару з Масквы Я. Шыраеву (нумар за 5 лютага). Пасля публікацый у рэдакцыю пайшлі тэлефонныя званкі з просьбай паведаміць: а якая афіцыйная пазіцыя наконт гэтай праблемы кіраўніцтва Рэспублікі Беларусь? Масла ў агонь падліло паведамленне агенцтва Рэйтэр, якое, са спасылкай на міністра замежных спраў Беларусі Пятра Краўчанку, зрабіла заяву, што Беларусь нібыта мае тэрытарыяльныя прэтэнзіі да Літвы... Аднак Старшыня Вярхоўнага Савета Беларусі Станіслаў Шушкевіч у час нядаўняга падпісання Заключнага акта Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе ў Хельсінкі заявіў літаральна наступнае: падпісанне Заключнага акта НБСЕ з'явіцца наглядным сведчаннем таго, што ў нас няма ніякіх тэрытарыяльных прэтэнзій да суседніх дзяржаў.

МАГЧЫМА, ТЭМА ГІСТОРЫІ НАШАГА РОДНАГА КРАЮ ЗАЦІКАВІЦЬ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ, ВУЧОНЫХ, ЧЫТАЧОЎ «ЗВЯЗДЫ» — УСІХ ТЫХ, КАГО ХВАЛЮЕ І НЕПАКОІЦЬ ЛЁС НАШАЙ АЙЧЫНЫ. ЗАПРАШАЕМ ДА РАЗМОВЫ.

ЗА АДУКАЦЫЮ, АКАЗВАЕЦЦА, ТАКСАМА ТРЭБА ПЛАЦІЦЬ

Жыццём авалодалі «каўбасныя» матывы.
Кожны, хто можа, — рве свой кавалак, герой дня — брокер, папулярная тэма ў прэсе — абяздоленыя пенсіянеры, а тут пра навуку. Неяк неактуальна? Магчыма, магчыма. Банальна прагучыць той пункт погляду, што ад стану навукі залежыць будучае. Тады павернем так:
ВНУ — гэта перш за ўсё моладзь, прычым найбольш здольная. Яна праводзіць у інстытуце некалькі гадоў, іх трэба пражыць нармальна. Апрача таго, моладзь, па традыцыі, самая актыўная частка грамадства.
Не звяртаць увагі на яе патрэбы — значыць, дачакацца чагосьці непрыемнага. Таму з прарэктарам Белдзяржуніверсітэта П. І. БРЫГАДЗІНЫМ мы гутарылі не толькі аб чыстай навуцы. І не столькі.

— Пётр Іванавіч, у якім стане зараз «альма-матэр», БДУ?

— Натуральна, што аазісам сярод пустыні мы не выглядаем, хоць маем фінансаванне не ў меншых памерах, чым раней. Усяго гэта каля 20 мільёнаў. Праўда, трэба ўлічваць, што ўсе выдаткі павялічыліся ў некалькі разоў.

— ...І гэтая, на першы погляд, вялікая сума — дробязь?

— Так бы я не сказаў, але гэтага, канешне, недастаткова. Дзесяткі вучэбных карпусоў, абсталяванне для іх, інтэрнаты. Наогул, цяжка сказаць, што будзе далей. 1.670 рублёў атрымлівае зараз дацэнт, 2.100— прафесар. Вучыцца ўсё жыццё, прайсці ўсе ступені навуковай кар'еры і ў рэшце рэшт мець зарплату меншую, чым у сантэхніка — з гэтым цяжка пагадзіцца.

— А студэнты?

— Тут градацыя ў залежнасці ад поспехаў у вучобе — ад 280 да 360 рублёў.

— Недзе ў раёне мяжы беднасці?

— Так. І гэта не ўсё. Значна павялічыліся выдаткі на ўтрыманне інтэрнатаў. Відаць, у нас не будзе іншага выйсця, як толькі павялічыць плату за іх. Мы разумеем, што гэта ўдарыць літаральна па кожнаму, хто жыве ў інтэрнаце, хто прыехаў з другога горада і каму і без таго прыходзіцца не вельмі соладка. Але што рабіць?

Больш таго, урад ставіць пытанне аб скарачэнні прыёму ў ВНУ.

— Цікава, як ставіцца да гэтага вучоны свет?

— Адмоўна. Нельга гэтага рабіць. Я ўжо не кажу пра чыстую навуку. Тут на першы план выступаюць прычыны сацыяльныя. Беспрацоўе ўжо ўваходзіць у наша жыццё, становіцца рэальнасцю. Першай пацерпіць ад яго, як заўсёды, менавіта моладзь. У гэтым сэнсе вучоба — хоць нейкі занятак. На Захадзе універсітэты вучаць па 8 гадоў. Скажам, чалавек не можа аплаціць за навучанне. Калі ласка, ідзі падзарабі і вяртайся. Усё ж такі гэта лепш, чым кідацца ў наркаманію, займацца нейкімі сумніцельнымі справамі.

Мы спрабуем захаваць прыём прыкладна на тым жа ўзроўні. Што з гэтага атрымаецца — не ведаю.

— Пётр Іванавіч, а ці варта? Калі чалавек занадта ўпэўнены ў сваім лёсе, то наўрад ці ён будзе стараццa. І ў выніку атрымаеш зноў жа «троечніка». Іх і так зашмат. Дарэчы, вы чалавек дасведчаны, давайце параўнаем, скажам, лонданскага і мінскага студэнтаў. Хто каму дасць фору?

— Мне здаецца, гэта некарэктна. І ў іх, і ў нас ёсць свае плюсы і мінусы. А я скажу, што на міжнародных алімпіядах нашы студэнты заўсёды займаюць прызавыя месцы.

— Тым не менш, нашы дыпломы на Захадзе не прызнаюць.

— У Марока я сустракаўся з нашымі выпускнікамі. Запомнілася гутарка з прэзідэнтам адной электратэхнічнай кампаніі. Ён заканчваў ВНУ ў Саюзе і вельмі станоўча адгукаўся пра нашу сістэму навучання. Абяцаў, што адправіць дачку на вучобу менавіта да нас.

— Натуральна. Нашы замежнікі плацяць па 1.000 долараў за год навучання — у 4-5 разоў менш, чым у амерыканскім каледжы. Я на месцы мараканца зрабіў бы тое ж самае.

— Ну навошта так спрашчаць? Амерыканцы лічаць, што нашы праграмы вельмі ўдала скампанаваныя, рознабаковыя. Шмат курсаў, якія даюць агульную падрыхтоўку. Дарэчы, яны нам кажуць, не адмаўляйцеся ад таго добрага, што ў вас ёсць.

— Пётр Іванавіч, кіраўніцтва універсітэта па-ранейшаму арыентуецца толькі на ўрад?

— Гэтага не было і раней. Нагадаю: мы дзейнічалі па гаспадарчых дагаворах, па рэспубліканскіх і саюзных праграмах. Да гэтага зараз прыплюсавалі камерцыйныя структуры: малыя прадпрыемствы, платны факультэт падрыхтоўкі да паступлення і г. д.

— Мяне ўсё цягне на параўнанні. На Захадзе універсітэт не мае камерцыйных структур, затое ёсць мецэнаты, усялякія фонды. За кожным моцным ВНУ стаіць адна ці нават група фірм. У нас такога пакуль не назіраецца?

— На жаль, не. У нас, прабачце, мала багатых і разумных. Я разумею: ідзе працэс першапачатковага накаплення капіталу. Не да навукі. Аб дабрачынных фондах пры ВНУ чуваць таксама рэдка. Аб гэтым гаварыць трэба тады, калі з'явіцца моцная, развітая эканоміка. Калі прадпрымальнікі зразумеюць тое, што ўжо даўно зразумелі ў свеце: укладанні ў адукацыю — адны з самых выгадных.

— І пакуль гэтага няма, ёсць дрэнна падрыхтаваныя спецыялісты. Можа, не трэба нікога прымушаць, а проста ўвесці платнае навучанне?

— Гэта справядліва. Мы мяняем ідэалогію, мы гаворым — усё трэба зарабіць. У тым ліку адукацыю. Амерыканцы робяць так: кампанія адкрывае крэдыт маладому чалавеку, а пасля заканчэння каледжа і прыняцця на работу крэдыт пагашаецца. Не — вярні яго назад. Стымулюе вельмі добра. Канешне, гэта магчыма ў будучым. Зараз распрацоўваюцца праекты платнага і бясплатнага навучання. Ну, напрыклад, студэнт вучыцца колькі хоча, але дзяржава плаціць толькі за 4 гады. Ужо цяпер мы пачынаем працаваць з тымі, хто жадае вучыцца. Магчыма, будзе адкрыты прыём, а потым селекцыя, адбор лепшых.

— Упэўнены: пачнецца шум наконт сацыяльнай справядлівасці. Чаму маю дачку адлічылі, а суседаў сын вучыцца? Тут таксама прыйдзецца прывыкаць да непрыемнага. Але, дзякуй, Пётр Іванавіч, за гутарку.

Інтэрв'ю ўзяў Сяргей ШАЎЦОЎ.

ВАША ПІСЬМО АТРЫМАЛІ

ЦІ ВАРТА ПРАВЯРАЦЬ ПРАВЕРАНАЕ?..

Гэта высокая, мажная, на першы погляд, прыстойная наведвальніца ў доўгім цёмнасінім плашчы не зайшла, а, што называецца, уварвалася ў рэдакцыйны пакой.

— Вось, — яна беспардонна кінула на стол паперу і бескампрамісна заявіла: — Трэба прапячатаць у газеце гэтага нягодніка!..

З заявы вынікала, што «нягоднік» — гэта яе былы непасрэдны начальнік. Ён і на службу прыходзіць «пад градусам», і хабар бярэ, і з падначаленымі маладзіцамі «шуры-муры» разводзіць. Пералічваліся і многія іншыя «грахі», прытым агульнымі, абразлівымі словамі.

— Прабачце, — асцярожна намякаю наведвальніцы, якая нецярпліва дамагалася канчатковага рашэння, — але ў вашай заяве няма ніводнага доказнага факта.

— Якія яшчэ факты? — яна нездаволена зыркнула ў мой бок. — Факты — гэта ўжо ваш клопат. Вы і разбірайцеся, шукайце...

З далейшай размовы высветлілася, што праверкай гэтай скаргі займалася ўжо не адна інстанцыя, справа дайшла нават да суда, але ўсюды з адным вынікам — прэтэнзіі беспадстаўныя. Адным словам, агульнай мовы, або, як цяпер модна гаварыць, кансенсусу мы не знайшлі, застаўся толькі непрыемны асадак ад гэтага візіту. І ўспомніўся ён па той простай прычыне, што, на жаль, нагадвае некаторыя пісьмы, сігналы, скаргі нашых чытачоў. Чалавек, відаць, і сам сумняваецца, не ўпэўнены ў правамернасці свайго пытання, атрымаў на яго падрабязнае тлумачэнне ці адмоўны адказ, аднак ўсё роўна лічыць сябе або прыкідваецца пакрыўджаным, піша ў газету, просіць дапамогі. Зразумела, рэдакцыя не пакідае скаргу без увагі, накіроўвае часам у даволі высокую інстанцыю. Яе правяраюць спецыялісты, нярэдка цэлыя камісіі. А што аказваецца ў канчатковым (добра, калі ў канчатковым) выніку? Дарэмны занятак, нікому не патрэбная работа, справа, нявартая выдзеленага яйка.

Менавіта тое ж атрымалася і з праверкай пісьма, якое дасла ў «Звязду» з в. Забярэзе Валожынскага раёна Г. Рапавец. Яна скардзілася, што здала ў мясцовую нарыхтоўчую арганізацыю 318 кілаграмаў мяса, каб набыць многааперацыйную швейную машыну, але яе не ўбачыла, як сваіх вушэй. Выходзіць, чалавека падманулі, абвялі вакол пальца?

У адказе намесніка старшыні Мінскага аблспажыўсаюза І. Матыліцкага паведамляецца, што гэта зусім не так. Г. Рапавец здала мяса ў сакавіку 1990 года, а пазней падала заяву на набыццё гэтай самай швейнай машыны. Для сусрэчнага продажу летась іх у раён паступіла 10 штук, і на адну была выслана запрашальная паштоўка аўтару пісьма. Аднак у вызначаны тэрмін яна не з'явілася за сваёй пакупкай. Каб (дарэчы, па яе ж віне) не пахінуць здатчыцу з пустымі рукамі, ёй, па яе згодзе, замест швейнай машыны прадалі палас. Дык чаго і на каго скардзіцца?

Даволі сумную карціну нарысавала ў сваім лісце мнагадзетная маці з в. Рымашы Браслаўскага раёна В. Магрын. Як яна пісала, «дзяцей няма ў што ні апрануць, ні абуць». У наш нялёгкі час не паверыць у гэта было нельга, а тым больш не паспачуваць, не дапамагчы.

Намеснік старшыні Браслаўскага райвыканкома К. Велічковіч даў такую даведку: у доме В. Магрын толькі двое дзяцей дашкольнага і школьнага ўзросту, астатнія трое — дарослыя: адзін служыць у арміі, іншыя — працуюць. Тым не менш гэта сям'я не аказалася абдзеленай. Толькі па картках у гандлёвай сетцы на тэрыторыі сельсавета яна за апошні час набыла тавараў больш дваццаці назваў. Гэта без уліку рэчаў, купленых па візітках.

Не падумайце, што нехта збіраецца пераглядаць чужы гардэроб, а тым больш яму зайздросціць. Ні ў якім разе! Ды і ў рэагаванні ёсць спавадка, што «адначасова забяспечыць усімі таварамі ўсіх жадаючых практычна немагчыма». Галоўнае, што тую ж сям'ю В. Магрын ніхто не абыходзіць увагай. Скажам, на тэлевізар яна ў спісе пад № 140, а на іншыя дэфіцытныя рэчы стала на чаргу толькі 8 студзеня сёлетняга года. І, як зазначае К. Велічковіч, «іншыя тавары народнага спажывання ёй будуць выдзелены згодна з чаргой і па меры паступлення». Правільна, справядліва? Не сумняваемся.

«Рэдакцыям часопіса «Вожык», газет «Звязда», «Праца» — так значыцца ў адказе, які даслаў старшыня Пінскага гарсавета В. Цімошчанка. Аб чым ён паведамляе адразу ў тры рэспубліканскія выданні? Аб тым, што заявы грамадзянкі В. Ягоравай неаднойчы правяраліся праваахоўнымі органамі і прэтэнзіі яе прызнаны незаконнымі. Аднак яна працягвае пісаць, пераважна ў рэдакцыі газет і часопісаў, «нягледзячы на вусныя і пісьмовыя тлумачэнні па сутнасці пытання».

У чым заключаецца гэта «сутнасць пытання»? У тым, што дом, які некалі належаў маці В. Ягоравай, быў знесены ёю самой, як струхлелы, а зусім не для адводу зямельнага ўчастка пад расшырэнне завода «Камертон». А калі так, то ніякай кампенсацыі па заканадаўству ёй не належыць і патрабаванні яе беспадстаўныя. Як кажуць, закон ёсць закон. Навошта тады бясконцымі пісьмамі атакаваць рэдакцыі, дамагацца праверкі шмат разоў праверанага?

Кажуць, што лепшы метад абароны — атака. Менавіта яго і выбраў манцёр лінейнага ўчастка Віцебскай дыстанцыі пуці В. Ігнаценка. Ён у сваім пісьме прасіў не толькі абараніць яго ад несправядлівага суда, а паказваў сябе гэткім пакрыўджаным анёлам, бездапаможнай ахвярай. Выходзіла, ні ён, 40-гадовы дзяцюк, сярод белага дня, прынародна змалаціў рукамі і нагамі непаўналетняга В. Лашко, а бачыце, той пагражаў яму расправай. Таму, паводле довадаў В. Ігнаценкі, судзіць трэба не яго, а кайперш В. Лашко.

Тым не менш, крымінальная справа была заведзена на В. Ігнаценку. Як паведаміў намеснік пракурора Віцебскай вобласці В. Жыгаленка, віна В. Ігнаценкі (дарэчы, раней ужо атрымаўшага працяглы тэрмін) у наўмысным нападзенні на падлетка даказана. Гэта пацвердзілі відавочцы яго дзікунства, а таксама акт судова-медыцынскага агляду пацярпеўшага, іншыя матэрыялы крымінальнай справы.

Хочацца зазначыць, што не ўсе пісьмы, скаргі, заявы, сігналы, як і рэагаванні, адказы рэдакцыя прымае, што называецца, за чыстую манету. Так, трапляюцца сярод іх паўрхоўна-недакладныя або звычайныя бюракратычныя адпіскі, якія не могуць задаволіць ні чытачоў, ні газету. Такія «допісы» мы бяром на кантроль, накіроўваем на новы разгляд. Але, скажыце, ці заўсёды варта правяраць не раз і кампетэнтна праверанае?

Пагадзіцеся, марная і нікому не патрэбная гэта справа!

Іван БРАЛКА,
загадчык аддзела пісьмаў «Звязды».

ВОЗГАЛАС РОЗГАЛАС

Толькі багатая краіна можа па-сапраўднаму абараніць тых, хто мае ў гэтым вострую патрэбу,—

сказаў на сустрэчы з бацькамі, чые сыны загінулі ў мірны час у арміі, Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. С. ШУШКЕВІЧ

...Іх гору нельга не спачуваць — яно састарыла іх раней часу, адабрала здароўе, пазбавіла радасці жыцця. Тым больш, што многія з іх страцілі адзінага сына. І тым больш, што здарылася гэта ў мірны час.

Бацькі загінуўшых давялі да С. Шушкевіча свае прапановы: знізіць ім пенсіённы ўзрост, выплаціць больш-менш значную грашовую кампенсацыю за загінуўшых у арміі дзяцей, вярнуць на радзіму тых, хто дэзерціраваў з арміі і зараз знаходзіцца ў Германіі. На іх думку, салдаты не павінны прыцягвацца да адказнасці, за выключэннем тых, хто ўчыніў крымінальнае злачынства. Яны дамагаюцца таксама шырокага доступу прадстаўнікам Камітэта салдацкіх маці ў воінскія часці...

І гэты пералік — далёка не поўны.

Размова аказалася няпростай, што і зразумела. Кіраўнік парламента рэспублікі паабяцаў, што заява Камітэта салдацкіх маці будзе разгледжана ў камісіях Вярхоўнага Савета. Генеральны пракурор рэспублікі атрымае даручэнне перагледзець усе справы, звязаныя з забойствам салдат на тэрыторыі Беларусі...

Праўда, нельга гарантаваць, што будуць задаволены ўсе магчымыя спосабы ўздзеяння на так званую «парламенцкую большасць» — ну, хіба што па падлозе перад імі не сляліся.

— **Але ж ёсць і варыянт рэарганізацыі Вярхоўнага Савета.**

— Яшчэ ў лістападзе дэпутаты ад апазіцыі Баршчэўскі, Дзейка і Новікаў распрацавалі праект рэарганізацыі Вярхоўнага Савета, дзе прадугледжвалася пераўтварэнне яго ў з'езд і стварэнне Сойма — прафесіянальнага парламента, у якім мог бы працаваць кожны жадаючы дэпутат. Шушкевіч прапаноўваў выбары парламента дэпутатамі — натуральна, пры гэтым няўгодныя кансерватыўнай большасці апазіцыянеры былі б «адсеяны». Зрэшты, не прайшло ні адно, ні другое. І на гэты раз ніякая прапанова па рэформе не атрымае належнай падтрымкі — занадта шмат дэпутатаў, якіх задавальняе па два-тры месяцы драмаць на сесіях, атрымоўваць і сутачныя, і зарплату па месцы працы...

А калі зірнуць за сцены парламента? Калі ў Вярхоўным Савеце яшчэ ёсць некалькі дзесяткаў дэмакратаў, то чым ніжэй — тым меней плюралізму, тым макалітней сцяна каменклатуршчыкаў. Старшыня райвыканкома, начальнік міліцыі і старшыня райспажыўсаюза — гэтая «тройка» і да гэтай пары вяршыць лёс усіх і кожнага. Таму апазіцыя год назад прапаноўвала законапраект аб мясцовым самакіраванні, дзе прадугледжвалася рэарганізацыя структуры мясцовай улады, прамыя выбары мэраў і г. д. Станіслаў Станіслававіч лічыць, што падобную рэарганізацыю трэба рабіць раней за змену вышэйшай заканадаўчай улады — і мне цяжка аспрэчваць гэты тэзіс. Але давайце зірнем на склад нашага парламента: хіба гэтыя людзі, якія якраз і трымаюць на месцах уладу — будуць галасаваць супраць сябе?

Словам, наш Вярхоўны Савет дасягнуў мяжы дэмакратызацыі. Так, Станкевіч мае рацыю: пры першапачатковай зададзенасці на метр парламент скочыў на метр дваццаць—але ж цяпер планка ўстаноўлена на два трыццаць.

— **Вы маркуеце, ёсць гарантыя, што ў выніку новых выбараў прыйдуць выключна кампетэнтныя, дэмакратычна настроеныя дэпутаты?**

— Складанае пытанне. Цяперашняя стомленасць людзей, іх раззлаванасць даюць, канешне, вялікія перавагі люмпенізаваным лідэрам, тым, хто гучней крыкне «Далоў!» на плошчы. Што і казаць, нам таксама ставяць у дакор, што мінулая выбарчая кампанія была пабудавана на татальнай крытыцы камуністычных структур. Сапраўды, наша праграма ўтрымлівала прынцыповыя палажэнні — суверэнітэт, дэкамунізацыя грамадства, рынак, але ўсё гэта мела даволі абстрактныя абрысы. Два гады напружанай працы ў парламенце далі і веды, і вопыт, хоць, магчыма, да прафесіяналаў у класічным разуменні парламентарызму яшчэ далёка. Але ж і грамадства за гэты час рушыла наперад, узняўшыся на больш высокі ўзровень палітычнай свядомасці. Безумоўна, на выбарах — па округах — праскочыць нейкая колькасць жырыноўскіх, але партыйныя спісы, думаю, кампенсуюць гэта новымі палітыкамі, якія прыйдуць з жаданнем працаваць канструктыўна.

Так, партыі ў нас яшчэ не зусім сфармаваныя і для вялікай часткі насельніцтва малавядомыя. А для вяскоўцаў — дык і зусім невядомыя. Дарэчы, Станкевіч зусім дарэмна лічыць, што БНФ ідзе на рэферэндум выключна таму, што мае самую ўстойлівую структуру і перакананы ў перамозе: мы цудоўна ведаем, якую прапаганду разгарнулі супраць нас у правінцыі. Але выбары якраз і прадастаўляюць народу найлепшую магчымасць параўнаць праграмы палітычных рухаў, ды і самі партыі сталеюць.

— **У апошні час прыкметна напружанымі сталі адносіны паміж С. Шушкевічам і парламенцкай апазіцыяй. Чым Вы тлумачыце гэта?**

— З самага пачатку свайго «старшынства» Шушкевічу трэба было згуртаваць вакол сябе дэмакратычныя сілы, прыцягнуць да супрацоўніцтва як мага большую колькасць дэмакратычных дэпутатаў. Так, не ўсе маюць патрэбны вопыт, у некаторых яшчэ захаваўся «мітынговы сіндром» — але іншых пакуль няма, трэба працаваць з гэтымі, вучыць іх, у рэшце рэшт. А Станіслаў Станіслававіч метадычна адштурхоўваў іх ад сябе, а з некаторымі паспеў нават і пасварыцца. Я не ведаю, хто тут больш вінаваты — ён ці мы, але ж ведаю, што гэта не на карысць справе.

— Я хацеў сказаць яшчэ вось што. Як бы мы ні наракалі на гэты Вярхоўны Савет, але пасля дзесяцігоддзяў таталітарызму гэта быў першы вышэйшы орган улады, у якім былі прадстаўлены дэмакратычныя сілы, які вельмі няпростым і пакутлівым шляхам прыняў найважнейшыя для лёсу Беларусі рашэнні. Скажу больш — ні папярэдні, ні наступны склад парламенту не выклічуць у будучых даследчыкаў такую цікавасць, і стэнаграмы яго сесій з'явяцца матэрыялам не адной дысертацыі. Словам, цяперашняму Вярхоўнаму Савету забяспечана месца ў гісторыі.

Гутарыў Валянцін ЖДАНКО, палітычны аглядальнік «Звязды».

Аб праверцы прадпрыемстваў і арганізацый рэспублікі па пытаннях цэнаўтварэння

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

У першую чаргу на павелічэнні цаны адбіўся рост матэрыяльных затрат, яны павялічыліся ў разліку на 1 камплект у 5,5 раза (з 4 да 22 руб.). Гэта звязана з рэзкім павелічэннем кошту пастаўляемай бавоўнянай пражы.

Істотна ўзрасла і заработная плата. У разліку на 1 камплект яна склала 4 руб. 15 кап. замест 1 руб. 60 кап. раней. Сярэднямесячная заработная плата аднаго рабочага ў студзені г. г. павысілася да 1.749 руб. (у I квартале 1991 г. была 159 руб., у IV квартале 1991 г. — 673 руб.). Больш чым у пяць разоў узраслі іншыя затраты (з 2 да 11 руб.).

Прадпрыемства вызначыла прыбытак у разліку на адзін выраб па 14 руб. (38 прац. да сабекошту), а таксама падатак на дабаўлены кошт у памерах 7 руб. 60 капеек.

Прадукцыю фірма «Світанак» рэалізуе праз аптовую базу. З улікам гэтага гандлёвая накідка ў разліку на адзін камплект склала 19 руб. 80 кап., або 33 працэнты да адпускной цаны.

Усяго на прыбытак прадпрыемства, падатак на дабаўлены кошт і гандлёвую надбаўку прыпадае 41 руб. пры свабоднай рознічнай цане 79 руб. 80 капеек.

Як паказваюць праверкі, гандлёвыя надбаўкі ўстанаўліваюцца, як правіла, у максімальным памерах (25 прац.). Мінгандаль і Белкаапсаюз не ажыццявілі дыферэнцыяцыю гэтых надбавак з улікам фактычных затрат па рэалізацыі прадукцыі. У гэтых умовах на дарагія прадукты і тавары надбаўкі вельмі высокія.

Так, пры рэалізацыі адной трубкі шпалер вытворчасці Гомельскага папярова-лесахімічнага завода (цана 132 руб.) гандлёвая надбаўка складае 33 руб., каўбасы «Раўбіцкай» (цана 225 руб.) — 45 руб. за адзін кілаграм, камплект мяккай мэблі «Лакнея-3» Барысаўскага дрэваапрацоўчага камбіната (15,7 тыс. руб.)—3,9 тыс. рублёў, набор для ваннага пакоя «Камфорт» аб'яднання «Белпласт» (1.463 руб.) — 363 рублі (да лібералізацыі цэн гэты набор прадаваўся па 348 руб. за камплект). Гандлёвая і аптова-збытавая надбаўка на пальчаткі скуряныя Гродзенскай фабрыкі з айчыннага скуратавару складае 66 руб. (цана 266 руб.), з імпартнай скуры — 231 руб. (931 руб.), пры адных і тых жа затратах гандлю па іх рэалізацыі.

Праверкамі ўстаноўлена, што на асобныя віды тавараў цэны штучна ўзвінчваюцца. У горадзе Мінску ЦУМ закупіў праз біржу 1.000 электраміксераў «Віхар», якія выпускае мінскае вытворчае аб'яднанне «Белвар», і прадаваў іх па 2.062 руб. (да 1 студзеня г. г. яны рэалізоўваліся па 155 руб. за штуку). Для таго каб узвінціць цану, гэтыя міксеры прапушчаны праз Мінскую таварную біржу вытворцаў і чатыры малыя прадпрыемствы («Стандарт», «Бярэсце», «Акіян-Поліш» у Брэсце і «Арэса-сервіс» у г. Мінску). Пры адпускной цане завода 525 руб., прайшоўшы праз біржу і малыя прадпрыемствы, цана міксера, які паступіў у ЦУМ, склала 1.650 рублёў. ЦУМ зрабіў яшчэ гандлёвую надбаўку 25 працэнтаў, або 412 рублёў. З улікам гэтага рэалізацыйная цана міксера склала 2.062 рублі.

Дэпартамент эканамічнага кантролю забраў у ЦУМа за завышэнне цэн за рэалізаваныя міксеры неабгрунтавана атрыманую выручку і штраф у суме 19,1 тыс. рублёў.

Праверкамі ўстаноўлены факты рэалізацыі праз біржу прадукцыі, вытворчасць і рэалізацыя якой з'яўляецца манаполіяй дзяржавы. Так, калгас «Цімкавіцкі» (старшыня Ляшчына Е. Т.) Капыльскага раёна ў парушэнне пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 16 кастрычніка 1991 г. № 386 рэалізаваў праз брокерскую кантору (брокер Вазнюк А. С.) Аграпрамбіржы 1.240 дэкалітраў спірту-сыраду па сярэдняй цане 47 руб. за 1 літр. Дэпартамент эканамічнага кантролю прымяніў да калгаса эканамічныя санкцыі па пералічэнню ў бюджэт 590 тыс. рублёў.

З мэтай недапушчэння неабгрунтаванага росту цэн было б правільным часова забараніць рэалізацыю прадуктаў харчавання і тавараў народнага спажывання праз біржы.

На рэзкім росце цэн адбіваецца таксама пасрэдніцтва малых прадпрыемстваў у забеспячэнні дзяржаўных прадпрыемстваў сыравінай.

Праверкай мінскага вытворчага аб'яднання «Камунарка» і таварыства з абмежаванай адказнасцю вытворча-, гандлёва-камерцыйнага прадпрыемства «Беларусь» (статут зарэгістраваны Ленінскім райвыканкомам г. Мінска) устаноўлена, што гэтае прадпрыемства закупляла кукурузную патаку на Верхнеднепроўскім крухмала-патачным камбінаце Днепрапятроўскай вобласці па сярэдняй цане 754 руб. за 1 тону, а рэалізоўвала вытворчаму аб'яднанню «Камунарка» у сярэднім па 2.771 руб. за тону. Набыццё дарагой сыравіны адбілася ў канчатковым выніку на цане цукерак. Свабодная рознічная цана карамелі «Му-му» павысілася з 4 руб. за кілаграм да 33 руб., карамелі «Аляня» — з 3 руб. 50 кап. да 35 руб., ірысу «Залаты ключык» — з 5 руб. да 50 рублёў. За ажыццяўленне пасрэдніцтва прадпрыемства «Беларусь», не прымаючы ўдзелу ў непасрэднай вытворчасці прадукцыі, атрымала прыбытку 2,3 млн. рублёў.

Заснавальнікам прадпрыемства «Беларусь» з'яўляецца Ленінскі райхарчгандаль, навукова-вытворчае аб'яднанне па вытворчасці прадуктаў з бульбы, а таксама тры прыватныя асобы (сярод іх Кароль Ю. В. — дырэктар Ленінскага райхарчгандлю г. Мінска).

За аказанне пасрэдніцкіх паслуг аб'яднанне «Камунарка» ў верасні—снежні 1991 года паставіла прадпрыемству «Беларусь» 22 тоны цукерак для іх вывазу за межы рэспублікі, з якіх 3 тоны вывезена і 17 тон знаходзіцца на складах Ленінскага райхарчгандлю.

Праверкай Стаўбцоўскага райбыткамбіната ўстаноўлены факты неправамернага спагнання дадатковай аплаты за раней прынятыя і аплачаныя насельніцтвам заказы. У гэтым камбінаце за прынятыя ў лістападзе—снежні мінулага года заказы і выробленыя ў студзені г. г. з заказчыкаў спаганялася без належных на тое падстаў даплата, якая ў 1,5—2 разы перавышае раней прымяняемыя расцэнкі. Пры дзеючых на момант заказу расцэнках на пашыў мужчынскага касцюма (без кошту матэрыялу) 184 рублі з заказчыкаў было дадаткова спагнана 442 рублі, за пашыў дэмісезоннага паліто — адпаведна 130 і 340 рублёў. Усяго з заказчыкаў за студзень гэтага года дадаткова атрымана 40,9 тыс. рублёў. Дэпартамент абавязаў кіраўніцтва камбіната вярнуць насельніцтву незаконна атрыманыя сродкі.

Устаноўлены факты няправільнага прымянення цэн Пухавіцкім камбінатам хлебапрадуктаў. Гэты камбінат адпускаў халгасам і саўгасам камбікормы па завышаных цэнах — па 5 тыс. рублёў, замест 342 рублёў за адну тону. Па выніках праверкі Галоўнага ўпраўлення цэн Дзяржэканомплана, гаспадаркам, якім адпускаліся камбікармы, вернута 1,5 млн. рублёў. Завышэнне цэн на камбікармы для птушкі ўстаноўлены Мінфінам рэспублікі на Красназнаменскім камбікормавым заводзе. Заводу прапанавана вярнуць птушкагадоўчым гаспадаркам 310 тыс. рублёў.

Няправільна прымянялася цэны на шклозаводзе «Гута» Пастаўскага раёна. Шкляныя слоікі для кансервавай прамысловасці гэтае прадпрыемства рэалізавала спажыўцам па 3 і 5 рублёў, замест 2 рублёў за штуку. Сума завышэння цэн на шклозаводзе склала 2,8 млн. рублёў, якія вернуты спажыўцам.

Цяпер Галоўным упраўленнем цэн Дзяржэканомплана прапрацоўваецца пытанне аб устанаўленні дыферэнцыраваных гандлёвых надбавак па групах тавараў, выходзячы з гранічнага ўзроўню 20 працэнтаў, уключаючы надбаўку на карысць аптовага гандлёвага звяна, замест 33 працэнтаў дзеючых цяпер.

Дэпартамент эканамічнага кантролю, Галоўнае ўпраўленне цэн Дзяржэканомплана, Мінфін рэспублікі працягваюць работу па кантролю за правільнасцю фарміравання і прымянення цэн.

Уносіцца ў парадку інфармацыі.

М. А. ЛАЗНЯК, У. І. МІХАСЁЎ, М. Ф. РУМАС.

КАРМІЛЬЦЫ НА КАЛЕНЯХ?

У Мінску пачалася двухдзённая нарада, арганізаваная Саюзам аграрнікаў і Саветам калгасаў Рэспублікі Беларусь. У прысутнасці Старшыні Вярхоўнага Савета С. Шушкевіча камандзіры калгаснай вытворчасці выкладуць усё, што ў іх набалела за апошні час. Лібералізацыя цэн, неразумная падатковая палітыка могуць прывесці да катастрафічнага становішча як прамысловасць, так і сельскую гаспадарку. Паводле слоў дакладчыка А. Дубко, зараз у халадзільніках 26 тысяч тон мяса, якое не знаходзіць пакупніка з-за высокіх цэн. Спыняецца ў вёсцы сацыяльна-культурнае будаўніцтва. Думка многіх: калі не будуць тэрмінова прыняты меры па стабілізацыі эканамічнага становішча, у рэспубліцы магчымы голад.

М. БАЛАШОЎ.
Фота М. АМЕЛЬЧАНКІ.

«Вярхоўны Савет вычарпаў сябе і павінен мужна прызнаць гэта»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

ГУЧЫЦЬ БОСКАЯ ЛІТУРГІЯ

Лёс закінуў гэтага вядомага ў Беларусі харавога дырыжора і эбіральніка песеннага фальклору ў Пінск. Многія гады Уладзімір Раговіч кіраваў Дзяржаўнай рэспубліканскай харавой капэлай. Апынуўшыся ў палескай глыбінцы, Уладзімір Іосіфавіч цвёрда вырашыў стварыць камерны хор. Прайшлі ўжо ўсе рэпетыцыі, і нарэшце адбылася прэм'ера. На суд прыхільнікаў сур'ёзнай музыкі была вынесена Боская літургія Іаана Златауста, напісаная Раговічам на аснове кіеўскіх і Знаменных распеваў і іншых першакрыніц. Літургія, якая складаецца з 25 частак, прагучала на галоўнай сцэне горада і была з захапленнем сустрэта слухачамі.

Новы хор, аснову якога склалі выкладчыкі музыкі і спеваў, створаны пры гарадскім аддзеле культуры. У канцы сакавіка кіраўніцтвам рэлігійных арганізацый Бяла-Падляскага ваяводства ён запрошаны выступіць перад польскімі слухачамі.

КРЫМІНАЛЬНАЯ ХРОНІКА

І АХОВА ПРАЗЯВАЛА...

БРЭСТ. Амаль 2 тысячы літраў бензіну А-76 было выкрадзена ў адну з апошніх ночай з тэрыторыі брэсцкай МПМК-5. Прычым зроблена ўсё было нават з элементамі вынаходніцтва: зламыснікі нейкім чынам адсунулі масіўную бетонную пліту, за якой знаходзілася паліва. Вартаўнік пазавадамеснай аховы, які быў на дзяжурстве, нічога не чуў і не бачыў. Работнікі ж механізаванай калоны ў выніку такой «дыверсіі» на некалькі дзён з-за адсутнасці паліва змогуць прадоўжыць свае выхадныя.

РАБАЎНІКІ — «НАВАСЕЛЬЦЫ»

ГОМЕЛЬ. Злачынцы так нахабна сябе паводзяць у апошні час, што сярод белага дня «чысцяць» людскія кватэры. І рэдка ўдаецца іх затрымаць. Але вось гэты выпадак асаблівы.

У Заходнім мікраёне з пад'езда аднаго з дамоў у грузавую машыну двое маладых хлопцаў выносілі мэблю, тэлевізар, дыван. Хто-ніхто думаў: пераязджаюць людзі, і праходзілі міма. Але адзін чалавек спытаў «навасельцаў» прама ў лоб:

— Што робіце, хлопцы?

І тыя, нічога не адказаўшы, кінуліся наўцёкі. Мужчына пазваніў у міліцыю, якая спрацавала даволі аператыўна. Рабаўнікі — ніадзе не працуючы жыхар Днепрапятроўска і гамяльчанін, дарэчы, непаўналетні — праз некалькі хвілін ужо давалі паказанні, як узламалі дзверы і нанялі грузавую машыну, каб вывезці ўкрадзенае.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

НАВАТ ЗВЕР ТАК НЕ ЗРОБІЦЬ

На жаль, зноў паступіла паведамленне з разраду тых, што не паддаюцца ўспрыманню нармальнага чалавека. Мяркуйце самі.

Супрацоўнікі міліцыі затрымалі 28-гадовага сантэхніка аднаго з гарадскіх ЖЭСаў, які, знаходзячыся ў нецвярозым стане, згвалціў сваю 4-гадовую дачку.

Расследаванне праводзіць пракуратура Першамайскага раёна Мінска.

КЛІЕНТАЎ СТАЛА БОЛЬШ

ТАЛАЧЫН (Т. Махтадуй). Абслугоўванне кліента ў медвыцвярэзніку цяпер каштуе 250 рублёў. Здавалася б, гэта спыніць аматараў зялёнага змея. Але дзе там! Іх становіцца ўсё больш. Так у студзені — лютым тут пабывала ўжо 200 чалавек — на 80 больш, чым за гэты час летась. Абслугоўваючы персанал ледзь спраўляецца са сваімі абавязкамі, нагрузка расце з кожным днём. Востра адчуваецца недахват ложкаў.

Непадалёк ад медвыцвярэзніка ў падвале гарсавета на поўную магутнасць працуе камерцыйны вінна-гарэлачны магазін. З ранку да позняга вечара тут тоўпяцца асобы з фіялетавымі тварамі. А таму ў работнікаў міліцыі мацнее надзея, што бесправоўе ў бліжэйшы час іх не закране.

Я, ты, ён, яна — усе разам савецкая сям'я. Адзіная, непадзельная і мэтанакіраваная на агульную светлую будучыню. А каб туды весялей крочылася, возьмемся за рукі і з'яднаем свае сэрцы.

Сардэчнага яднання не адбылося. Ды мусіць і не магло адбыцца. Занадта розныя народы і звычаі. Вялікая савецкая сям'я распалася. Дзеці сталі жыць самастойным жыццём. Але, вядома, адзін без другога абысціся не могуць. Занадта шмат агульнай спадчыннасці. Вось толькі падыходы да яе атрымліваюцца розныя.

Мінгарсавет прыняў пастанову «Аб мерах па ўмацаванню барацьбы са злачыннасцю, па абароне правоў і інтарэсаў жыхароў горада Мінска». Вельмі, канешне, неадназначная пастанова. Прынята яна была зноў-такі з-за вельмі напружанай абстаноўкі, якая склалася ў Мінску, дзякуючы нашым іншагароднім гасцям. За некаторымі з іх цягнуўся і цягнецца след забойстваў, спекуляцыі, крадзяжоў дзяржаўнай і іншай уласнасці, наркотыкаў і г. д.

Пастанова абмяжоўвае іншагародніх грамадзян у куплі і арэндзе жылых памяшканняў, у гарадской прапісцы, у засяленні ў гарадскія гасцініцы без камандзіровачных пасведчанняў на тэрмін не больш 3 сутак, у рэалізацыі кветкавай прадукцыі (прапаноўваецца рэалізоўваць яе праз дзяржгандаль і спажыўкааперацыю).

Меркавалася, што гэтыя меры будуць насіць часовы характар. Прайшоў час, што змянілася? Можа, надышла пара іх адмяніць?

Паўднёвы госць горшы за татарына?

ПАЎДНЁВЫЯ ГОСЦІ — НЕ ЛЕПШЫЯ ГОСЦІ

Думка міліцыі

— Крайняя абвостранасць сітуацыі з асобамі, прыбыўшымі з паўднёвых рэгіёнаў краіны, засталася,— гаворыць начальнік штаба УУС Мінгарвыканкома палкоўнік міліцыі Валерый Страмбурскі.— Толькі за студзень гэтага года выяўлена 49 злачынстваў, здзейсненых іншагароднімі — а гэта ў асноўным госці з поўдня. У мінулым годзе за такі ж перыяд лічба была куды больш сціплай — «усяго» 23. Гэта раскрытыя злачынствы: забойствы, кватэрныя крадзяжы, наркотыкі, крадзеж дзяржаўнай і асабістай маёмасці, незаконныя валютныя аперацыі, хуліганства, разбой, гвалтаванні.

Не цураюцца нашы паўднёвыя госці і эканамічных злачынстваў. У друку паведамлялася ўжо, што ў багажніку самалёта «Мінск—Баку» былі знойдзена шмат масла, іншыя прадукты харчавання, прамысловыя тавары, якія вывозіліся за межы рэспублікі без усялякай ліцэнзіі. А вось госць з Азербайджана Рафаіл Курбаналі-аглы быў затрыманы прама на вул. Пляханава. Ён збіраўся пераправіць дамоў 14 скрынак масла. Прадукт канфіскаваны, а бакінец аштрафаваны на 5 тысяч рублёў. А колькі такіх «дзеячаў» не затрымана? Сотні, тысячы, дзесяткі тысяч? Пытанне, здаецца, безнадзейна павісае ў паветры.

У ходзе аперацыі «Апоўзень», праведзенай гарадской міліцыяй па апрацоўцы найбольш крымінагенных месц Мінска, былі праверены больш тысячы іншагародніх грамадзян. Выяўлены 5 злачынцаў, якія знаходзіліся ў вышуку, 15 асоб, што здзейснілі злачынствы, у тым ліку 6, звязаных з наркотыкамі, два выпадкі незаконнага захоўвання зброі...

Кожнае сёмае мінулагоднее злачынства «вісіць» на іншагароднім госцю, з якіх паўднёвым належаць 122, што таксама не дадае нам асаблівага аптымізму, калі гаварыць аб нашай з вамі недатыкальнасці з боку гасцей. Можна яшчэ сыпаць і сыпаць лічбамі. Але прыпынімся на адной — у ходзе названай аперацыі «Апоўзень» устаноўлена 118 кватэр, якія далі прытулак паўднёвым хлопцам. Нядаўна супрацоўнікамі аператыўна - пошукавага аддзела арыштаваны бакінец З., які летам мінулага года забіў сваю гаспадыню і яе дачку, а трупы расчляніў і схаваў у розных месцах.

Не хацелася б згушчаць цёмныя фарбы, але амаль кожны тыдзень паступае інфармацыя аб грабяжы асобамі ўказанай катэгорыі кватэр і іх уладальнікаў. Прыхопіць рэчы і паедзе ў сваю рэспубліку, дзе нашым операм часта проста паказваюць, прабачце, кукіш. Ніякай дапамогі беларускім праваахоўным органам з боку аналагічных паўднёвых не аказваецца. Праўда, Прыбалтыка, Украіна і Малдова ўсё ж дапамагаюць.

Спецыяльнае камароўскае аддзяленне міліцыі едымала на відэаплёнку адзін(!) дзень жыцця Камароўскага рынку, дзе, дарэчы, штодня бывае да 200 тысяч чалавек. І што? За відэакасету вартавым правапарадку прапанавалі на другі ж дзень 50 тысяч рублёў. Гэта была першапачатковая цана. На тым жа рынку ў мінулым годзе ўдалося абязшкодзіць 7 злачынных груп, якія займаліся рэкетам, махлярствам і іншымі непрыстойнымі заняткамі.

Да гэтага застаецца дадаць, што апошнім часам усё мацнее, усталёўваецца тэндэнцыя падзелу сфер уплыву ў горадзе паміж устойлівымі злачыннымі групамі іншагародніх грамадзян, якія актыўна процідзейнічаюць адна адной.

ГАСЦІНІЦА ДАЕ ДАБРО, АЛЕ З ВЯЛІКІМ СКРЫПАМ

Думка гасцінічнага боса

Штодзённа ў горад прыбывае 40—50 чалавек з рэгіёнаў Закаўказзя і Сярэдняй Азіі. І ўсім ім трэба не толькі займацца сваім бізнесам, але і аддачываць.

Дырэктар мінскай аб'яднанай гасцінічнай гаспадаркі, адначасова дырэктар гасцініцы «Беларусь», Мікалай Алёхін расказвае: «Разбэшчваюць іншых пастаяльцаў. Хлопцы маладыя, гарачыя, пры грашах. П'юць, кураць, ну, і ўсё астатняе... У гасцініцы «Спутнік» учынена 9 злачынстваў з удзелам паўднёвых хлопцаў. Праўда, нам выгадна іх засяляць. Цяпер тая ж «Беларусь» заселена толькі на 60 працэнтаў.

Так што мы, з аднаго боку, — за, з другога — супраць пастановы гарсавета».

Можна зразумець М. Алёхіна. Прыбытак — справа не жартоўная. Але ці толькі аб прыбытку ідзе гаворка? У ходзе таго ж «Апоўзня» ўстаноўлена, што адміністрацыі гасцініц «Беларусь», «Юбілейная», «Алгарыты», «Мінск», «Свіслач», «Спутнік» і іншых парушаюць патрабаванні пастановы гарсавета ў частцы прадаўжэння тэрміну пражывання, запаўнення анкет на пражываючых і г. д. Дзейсных мер кіраўнікі асобных гасцініц так і не прынялі.

«МІНСКАМ-АГЛЫ СТАНАВІЦЦА НЕ ХОЧАМ»

Думка гарадскіх улад

У той час, калі не на жарт ідзе спрэчка аб тым, з якой літарай трэба быць Мінску — з «і» ці «е», ёсць рэальная небяспека пераўтварэння яго ў які-небудзь Мінск-аглы.

І яшчэ. Дапусцім, што прыватызацыя ідзе з удзелам не толькі беларусаў. Няцяжка ўявіць, хто будзе скупляць кватэры, дамы, дробныя прадпрыемствы. І гэта не ўсё. Калі падлічыць той крымінальны зарад, які мы атрымліваем ад іншагародніх гасцей цяпер і памножыць яго на колькасць прыватызаваных кватэр...

Загадчык юрыдычнага аддзела, таксама старшыня пастаяннай камісіі Мінгарсавета па ахове правапарадку і пытаннях барацьбы са злачынасцю на грамадскіх пачатках Андрэй Харлап лічыць, што пастанову трэба было рабіць яшчэ больш жорсткай. А размова ідзе аб эканамічных інтарэсах рэспублікі, таму і гэтую пастанову павінен прымаць Вярхоўны Савет. «Але зрабіць гэта будзе цяжка», — канстатуе А. Харлап.

— Нас абвінавачваюць у антыгуманных, антыканстытуцыйных мерах. Але давайце паглядзім на цывілізаваны Захад. Калі англійскія балельшчыкі не паважаюць правіл знаходжання на стадыёне, іх проста не пускаюць у іншыя краіны ці на стадыёны. Хто хоча, каб паўтарыўся другі Базель?

Дык калі там справа ідзе аб кучцы футбольных фанатаў, то у нас — аб хлопцах са зброяй і з не вельмі чыстымі і сумленнымі намерамі. Гарадская ўлада павінна забяспечваць у першую чаргу захаванне канстытуцыйных правоў і інтарэсаў жыхароў горада і рэспублікі, а ўжо потым — нашых гасцей. Ці не так? І калі апошнія зарэкамендавалі сябе не самым лепшым чынам — некаторым з іх трэба проста адмаўляць у праве на ўезд у нашу рэспубліку.

«НЯПРАВІЛЬНАЙ ДАРОГАЙ ІДЗЕШ, КАЦО»

Думка аднаго з паўднёвых гасцей

— Нашто пісаць? Нашто? Прыходзь у госці, будзем каньяк піць, фрукты есці.

Аліх Байрамаў з Баку. Ён прадае хурму на Камароўцы. Канешне, нядрэнна зарабляе. Канешне, плаціць за права гандляваць, каму трэба. І канешне, лічыць пастанову і ўсё, што ўшчамляе правы іншагародніх, няправільным: «Ты хурму любіш? Любіш. А апельсіны, лімоны, мандарыны? Калі б вашы людзі ў нас не куплялі фрукты і другія рэчы, хіба ж мы стаялі б ля прылаўкаў? Твая галава хоць трохі думае? А вы яшчэ з купонамі сваімі... Нельга нармальна жыць, спаць, есці. Вы што, з намі сябраваць не хочаце? Будзеце тады на сваёй бульбе сядзець і малаком запіваць».

«А МОЖА, ТАК І ТРЭБА!» —

Думка аўтара

Сябраваць, безумоўна, хочам. У мяне самога ў арміі быў сябар ўзбек. Ды і ў ўвогуле, пра фрукты ўсё правільна. Але і пра рэстараны, і пра нажы ў кішэні большасці, пра кожнае сёмае іншагародняе злачынства таксама правільна. Помніце сюжэт, здаецца, ТСН, пра маскоўскіх таксістаў. Як яны даволі доўгі час не хацелі вазіць пасажыраў з паўднёвым загарам. Вядома, не з-за таго, што апошнія мала плацілі. А з-за таго, што гэтыя пасажыры маглі і выручку дзённую канфіскаваць, і машыну забраць...

Есць, ёсць сумленныя сяляне і рамеснікі, якія прыязджаюць да нас толькі з чыстымі намерамі. Але колькі іх? І чаму тады, калі за імі не стаіць нехта моцны, прыходзяць свае ж суайчыннікі патрабаваць у сваіх жа грошы і гатовую прадукцыю? Значыць, усё ж нешта не так на Камароўскім рынку (ды і не толькі на ім) у саміх адносінах паміж іншагароднімі гасцямі. Значыць, законы гасцінасці сапраўды больш важкія толькі на Усходзе. У нас жа можна ўсё ці амаль усё.

А можа і сапраўды так і трэба?

Аляксандр КОКТЫШ.

ЖАДАЕЦЕ ПРАЦАВАЦЬ
ЯК УВЕСЬ ЦЫВІЛІЗАВАНЫ СВЕТ?
ЗВЯРТАЙЦЕСЯ ДА НАС!
МЫ ПРАПАНУЕМ:
* персанальныя камп'ютэры
* прынтэры (фармат А4)
* плотэры (фармат А4)
* тэлефаксы
* ксераксы
* тэлефоны-аўтаадказчыкі
* радыётэлефоны фірмы "SNC"
• Дакладна ў тэрмін
• За рублі
• Па факту аплаты
Бухгалтарам і банкірам — 12-разрадныя калькулятары з друкавальным прыстасаваннем фірмы "CASIO"
Кошт зніжаны на 20 %!
Неадкладная пастаўка са склада ў Мінску
Dainova Co.,Ltd.
(0172) 588-704

Гандлю — адкрытыя граніцы, таварам — свабодны шлях!
Міжрэгіянальны універсальны кірмаш
«МІНСКІ КІРМАШ. ВЯСНА-92»
8—10 КРАСАВІКА 1992 г.
МЭТА КІРМАШУ:
садзейнічанне фарміраванню агульнага рынку ў рамках адзінай эканамічнай прасторы краін Садружнасці і развіццю дзелавых кантактаў з замежнымі фірмамі.
СПАДАРЫ!
ВАМ ПРАДАСТАЎЛЯЕЦЦА МАГЧЫМАСЦЬ ПРАВЕСЦІ АПТОВЫ ГАНДАЛЬ НА ЎЗАЕМАВЫГАДНЫХ УМОВАХ І ЗАКЛЮЧЫЦЬ ДОЎГАТЭРМІНОВЫЯ ПАГАДНЕННІ АБ СУПРАЦОЎНІЦТВЕ.
Пасрэдніцкі збор з удзельнікаў не бярэцца.
ЗАЯЎКІ ПРЫМАЮЦЦА ДА 15 САКАВІКА.
Падрабязная інфармацыя па адрасу:
220050, г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 13, «Мінскі кірмаш».
ТЭЛЕФОНЫ: (0172) 53-89-05, 24-81-82.
ТЭЛЕТАЙП: 300494 «ФІОРД». ТЭЛЕФАКС: (0172) 27-15-96.

СМАЛЕНСКАЕ МП «Электрамантаж» рэалізуе
высакавольтныя жалезабетонныя апоры вышынёй 11 метраў.
Цана дагаворная.
ЗА ДАВЕДКАМІ ЗВЯРТАЦЦА ПА ТЭЛ. 3-47-93 У г. СМАЛЕНСКУ.

ВЫКОНВАЕМ РАМОНТ АЎТАМАБІЛЯЎ,
РЭАЛІЗУЕМ І ЎСТАНАЎЛІВАЕМ ЛАБАВОЕ ШКЛО.
ТЭЛ. У МІНСКУ 72-76-95
з 9.00 да 17.00.

ПРАДАЕЦЦА ШЧАНЯ
французскі бульдог (2 месяцы). Тэл. у Мінску — 45-45-89).

УНІВЕРСАЛЬНАСЦЬ І ЯКАСЦЬ — ЗА ЎМЕРАНУЮ ЦАНУ!
ФІРМА «ЭЙКАС-ВЕСТ»
ПРАПАНУЕ
КАМПЛЕКТНАЕ АБСТАЛЯВАННЕ
ДЛЯ АЧЫСТКІ ВАДЫ АД ЗАБРУДЖВАННЯЎ:
завісі любога дыяпазону буйнасці;
іонаў металаў гальванічных вытворчасцей;
нафтапрадуктаў, СОЖ, фарбавальнікаў;
тлушчаў, адходаў харчовай прамысловасці;
сумесяў пералічаных забруджвальнікаў.
Аплата ў рублях.
ТЭРМІН ВЫКАНАННЯ — НЕ БОЛЬШ ГОДА.
ЗДАЧА «ПАД КЛЮЧ».
Тэл. у Мінску (0172) 34-87-65 і 55-55-68.

РЭХА ПУБЛІКАЦЫІ

«...Жадае пазнаёміцца...»

Непрыемная рэч адзінота. Неабходнасць адчуваць сябе камусьці патрэбным у кожнага з нас, бадай, прыроджаная. І калі ў шаснаццаць здавалася, што ўсё яшчэ наперадзе, то ў 40, 50—дзе там, нават у 20!—пачынае наведваць думка аб бессэнсоўнасці, марнасці жыцця.

Прыходзіць нарэшце дзень, калі, усвядоміўшы сваю «нікому-не-патрэбнасць», небарака хапае чысты ліст паперы і дасылае даныя пра свае рост і вагу ледзь не ў першую службу знаёмстваў, што трапіла на вочы ў газеце. Або накіроўваецца ў адзін са шматлікіх шлюбных кааператываў, дзе запаўняе даўжэзную анкету сваіх жаданняў. Праходзіць пэўны час у чаканні шчасця...

І вось тады (часцей менавіта тады, калі ўсе магчымыя варыянты перабраны і праверана на практыцы) звяртаюцца да яе... «сваці старых добрых часоў», як сама і напісала ў адным з лістападаўскіх нумароў «Рекламного приложения».

Зацікавіўшыся аб'явай, я міжволі ўявіла сабе мажную цётку ў гадах, назойлівую і цікаўную — памятаеце Астроўскага? Але Клара Рыгораўна (такое імя я пачула з-за дэфекту тэлефоннай сувязі, калі дамаўлялася аб сустрэчы) аказалася нечакана мілай і прыемнай жанчынай, вельмі цікавай субяседніцай. Выбар свайго незвычайнага «хобі» (прафесіяй яе дзейнасць, напэўна, яшчэ нельга назваць: практыка надта малая, ды і дапамога, як высветлілася, большай часткай бескарыслівая. «Размаўляеш, бывае, з чалавекам, глядзіш—пасябравалі. А як з сябра грошы браць?») Клара Рыгораўна растлумачыла даўняй, з універсітэцкіх гадоў, цікавасцю да псіхалогіі. Шмат займалася, чытала спецыяльную літаратуру, ды і зараз ведае амаль пра ўсе навінкі ў гэтай галіне. А два гады назад стала задумвацца аб «уласнай справе».

— Вельмі шмат адзінокіх навокал. (Цяжка не пагадзіцца з такім сцвярджэннем). Хто ім дапаможа? Ні шлюбныя аб'явы, ні кааператывы не гарантуюць таго, што ад іх чакаюць. Пісьмы — большай часткай стандартныя, неканкрэтныя, вельмі цяжка сярод іх знайсці менавіта сваё. А шлюбныя канторы... Хіба можа машына зразумець чалавечую душу, характар?..

Дык чым жа адрозніваецца дзейнасць сваці ад дзейнасці іншых службаў падобнага напрамку? Паспрабую апісаць «тэхнічны працэс». Уявіце: вам патрэбна пэўная дапамога. Па тэлефоне набіраеце нумар, дамаўляецеся ў зручны час і ў зручным месцы аб сустрэчы. Гадзіны паўтары на асабістую размову. Вяртаецеся дамоў і чакаеце. Праз нейкі час вам паведамяць тэлефонны нумар або адрас вашай надзеі, якая, дарэчы, ужо падрыхтавана да вашага званка ці візіту. Вось і ўсё. Далей — спадзявайцеся толькі на сябе.

— Пра вынікі, праўда, гаварыць яшчэ рана, тры месяцы — які тэрмін? — лічыць Клара Рыгораўна. Менавіта па гэтай прычыне яна папрасіла не называць яе сапраўднае імя ў газеце. «Пакуль усё ідзе гладка—каб не сурочыць! Вось калі справа будзе пастаўлена на шырокую нагу...» Яна і калегам па рабоце яшчэ не расказвала — Клара Рыгораўна працуе інжынерам - тэхнолагам на адным з мінскіх заводаў,—«у курсе» толькі блізкія сябры, суседзі, ну і, вядома, дамашнія.

Але ж калі крыху больш чым за тры месяца ў сучаснай сваці сабралася картатэка з двухсот абанентаў, напэўна, ужо можна гаварыць аб нейкім поспеху. Звяртаюцца да яе і 18—20-гадовыя маладыя людзі, і тыя, чый «шлюбны» узрост даўно перавысіў пенсіённы.

— Прычыны, па якіх такія людзі прыходзяць да мяне, самыя розныя, — паведаміла Клара Рыгораўна. — Была вось бабулька, 67 гадоў. Жыве з дзецьмі і ўнукамі ў невялікай кватэры. Жыве ў пастаянным напружанні, бо адчувае сябе непрыемным цяжарам для сям'і... Або дзяўчаткі маладзенькія. Здымае адна, напрыклад, пакой на ўскраіне горада. Сяброў небагата, пайсці пазнаёміцца? Куды?

Сапраўды, куды? Публіка нашых дыскатэк агульнавядомая: «малалеткі» пяшчотнага школьнага ўзросту ды добра падпіўшыя трыццацігадовыя дзецюкі. Рэстаран? Адна яна туды не пойдзе. Можна ў кіно. Калі вельмі пашанцуе, за вяжа знаёмства. А калі не?

У хлопцаў праблемы такія ж: няма куды пайсці. Калі характар не вельмі кантактны, а кола знаёмстваў абмежаванае, самы час клікаць на дапамогу.

Праўда, часцей да яе звяртаюцца ўсё ж людзі сталага ўзросту. Часта — «разведныя». Клара Рыгораўна нават сваю статыстыку склала — прычын, па якіх людзі разыходзяцца.

— На першым месцы, безумоўна, сацыяльна - эканамічныя прычыны. Псіхалагічныя ж—на другім... Быў вось выпадак. Прыходзіць неяк мужчына. Расказвае: з жонкай разышоўся вельмі даўно: яе не задавальняла тагачасная яго зарплата. Зараз на іншай рабоце пачаў зарабляць 100 тысяч у год, купіў машыну, задумаўся аб новай сям'і. Я прыкінула: ёсць, кажу, цудоўная жанчына, але ў яе — двое дзяцей. Дык што з таго? — адказвае. Не паверыце, цяжэй было ўгаварыць тую жанчыну сустрэцца з ім! Наогул, у нашых жанчын, асабліва старэйшага ўзросту, вельмі своеасаблівая псіхалогія: люблю дабрабыту ў жыцці павінна дабівацца сама, а калі ўжо каханне — дык тут няхай гаворкі пра грошы і быць не можа! Што-што, а маральнасць у іх на ўзроўні.

Раскажу яшчэ выпадак. Звярнулася да мяне адна жанчына. Знайшла я ў сваёй картатэцы чалавека — падыходзіць ёй, здаецца, ідэальна. Але яна замахала рукамі: толькі не ёй! Аказваецца, яны знаёмыя, нават працуюць разам. Ды калісьці па ім «сохла» яе сяброўка. І зараз жанчына непакоіцца толькі пра адно: крый Божа яе пакрыўдзіць!..

Былі, вядома, і непрыемныя сустрэчы. Пазваніў аднаго разу мужчына, дагаварыліся пра пэўныя час і месца. Яму 44 гады, а апрануты «пад хлопчыка», ды і манера размаўляць нейкая дзіцячая. Усё жыццё пражыў з мамай, жыве з ёй і зараз—такі вось стараваты «мамчын сынок». Вырашыў нарэшце ажаніцца. Так і шукае будучую «спадарожніцу жыцця»: абавязкова не старэй за 33 гады, прыгожую, высокую, матэрыяльна забяспечаную, з кватэрай... Прабач, дараж'энькі, а што ты прапануеш ёй узамен? Сябе? Дык навошта ты ёй такі?

І ўсё ж, за такім вось рэдкім выключэннем, ад сваёй дзейнасці Клара Рыгораўна атрымлівае вялізнае маральнае задавальненне. Пакуль што гэта амаль і ўсё. У перспектыве марыць арганізаваць уласную—і абавязкова прэстыжную! — кантору з добрай рэпутацыяй, тры-чатыры супрацоўнікі будуць абслугоўваць шматлікіх (у гэтым Клара Рыгораўна ўпэўнена) кліентаў.

— Але такая кантора — зусім у далёкай будучыні. Зараз жа няблага завесці хаця б сакратара — разбіраць багатую пошту. Зноў жа: яму трэба забяспечыць адпаведны заробак, а вялікага даходу я і сама яшчэ не атрымліваю...

Можа, калі-небудзь Клара Рыгораўна ўсё ж ажыццявіць сваю мару. А пакуль — тэлефон, што бесперапынна звоніць ледзь не ўсе 24 гадзіны ў суткі, 19-гадовы сын, які не заўсёды можа схаваць раздражненне ад такога не зусім нармальнага выцця ва ўласнай кватэры, надзея ў голасе тэлефонных абанентаў — і крышачку грошай звыш зарплаты—гэта яе сённяшні свет, яе жыццё.

Ірына ЗАВАДСКАЯ.

Як злачынцу ўтаймаваць?

Прачытаў нядаўна артыкул Л. Гранкоўскага «Учыніў злачынства — атрымлівай спаўна» («Звязда», № 21). Увагу прыцягнула не столькі апісанне сутнасці крымінальнай справы (іх цяпер тысячы, і сталі яны, на вялікі жаль, як бы звычайнай справай), а вывады, якія робіць аўтар. Ён прапануе дапоўніць крымінальнае заканадаўства нашай рэспублікі больш канкрэтнымі законамі, каб ніяк нельга было іх абысці. І калі артыкулам прадугледжваецца вышэйшая мера пакарання, значыць суд і павінен вызначыць яе, нягледзячы ні на якія акалічнасці. Можа і прымусіла б такая цвёрдасць задумацца патэнцыяльных злачынцаў?

Сапраўды, мы становімся сведкамі з'яўлення ў апошнія часы ў нашым грамадстве яшчэ адной улады — улады злачыннага свету, страху. І гэта ўлада, як ні крыўдна, дзейнічае на нашых вачах больш паспяхова, чым заканадаўчая, выканаўчая ці судовая. Той факт, што людзі з надыходам цемры баяцца выйсці на вуліцу, гаворыць сам за сябе. Ды і ўласная кватэра ўжо не ратуе. Чорная хваля злачынстваў набыла такія размеры, што нават органы ўнутраных спраў не з'яўляюцца для яе сур'ёзным сродкам стрымання. Такога ў нас яшчэ не было, каб народ у роспачы пачаў узбройвацца.

Дакацілася хваля злачынстваў і да вёскі. Ёсць у Клецкім раёне вёскі Грыцавічы і Заельня. За апошняе паўгоддзе тут адбылося звыш дваццаці выпадкаў крадзяжу хатняй і іншай маёмасці грамадзян. Рабаўнікі не грэбуюць нічым, пачынаючы з колаў аўтамашыны «Запарожац», якая належыць аднаму з жыхароў вёскі Заельня, інваліду вайны, і канчаючы кубламі з салам, пральнай машынай... Як, скажыце, быць пенсіянерцы, якая дзеля набыцця на льготных умовах цукру, узяла для праполкі дзялку цукровых буракоў? А ў адну з начэй цукар укралі. Тут няма розніцы, хто гэта зрабіў, аднавясковец ці чужы. Цукар усё роўна не вернеш. Прапала нялёгкая праца старэчых рук. Але жаласцю паразіта не возьмеш, інакшай павінна быць з такімі гаворка.

Бывае задумаешся: а ці не азвярэлі мы цяперашнім часам? Нядаўна ў той жа вёсцы Заельня зрабілі добрую справу для людзей — пабудавалі крытыя аўтобусныя прыпынкі. Ні дождж, ні снег не страшныя. Ды камусьці гэтыя пабудовы, мусіць, здаліся непатрэбнымі. А калі так — знішчыць! І паразбівалі цёмнай ноччу. А ў суседніх Грыцавічах ліхтары на слупах залішне ярка асвятлялі вуліцу. І вось маладыя людзі з натхненнем і энергіяй дзікуноў папсавалі тыя ліхтары. Сяляне бачылі іх. Шкада, не пазналі, бо каб пазнаць, трэба падысці бліжэй. Вось толькі без зброі, ведаеце, нельга — небяспечна.

Днямі ў суседнім калгасе пры затрыманні злачынцы, які краў народнае дабро, быў вельмі цяжка паранены сяржант міліцыі Валерый Новік. Бандыт ударыў міліцыянера нажом.

Трэба сказаць, што ў пераважнай большасці мы ўсё ж за гуманізм. Аднак бываюць у жыцці перыяды, калі гуманнасць павінна прайсці выпрабаванне ледзь ці не жорсткасцю ва ўмовах надзвычайных, у імя выжывання ні ў чым не вінаватых людзей. Мы часта любім паўтараць, што жорсткасць параджае жорсткасць. Але заўважце, амаль увесь час гаворым у адным напрамку, маючы на ўвазе, што жорсткасць закона параджае яшчэ большую жорсткасць злачынцы. А сёння давайце возьмем ды скажам так: жорсткасць злачынцы павінна параджаць яшчэ большую жорсткасць закона. Мне здаецца, што тады мы станем больш чалавечнымі і спагадлівымі ў першую чаргу ў адносінах да ахвяр злачыннага свету. І гэта было б справядліва.

Але ў гэтым выпадку патрэбны адпаведныя законы. Хоць бы на той перыяд, які мы называем пераходным. Законы, па якіх суд і толькі суд будзе вызначаць меру пакарання. Такую задачу, як мы ведаем, пад сілу вырашыць толькі Вярхоўнаму Савету. Таму ад імя пацярпеўшых і ад імя тых, хто яшчэ непазбежна пацерпіць ад хвалі злачыннасці, звяртаюся да народных выбраннікаў з надзеяй, што яны прымуць законы, якія абароняць нас.

Уладзімір ЛОБАН.

Клецкі раён,
вёска Грыцавічы.

ТАЙМ-АЎТ

МОГ БЫЦЬ ЯШЧЭ АДЗІН РЭКОРД

Рэкардсмен свету па скачках з шастом Сяргей Бубка перамог у міжнародных спаборніцтвах, якія праходзілі ў Данецку. Яго вынік — 5 м 85 см. Рэкордная ж вышыня — 6 м 15 см — на гэты раз спартсмену не скарылася.

Другое месца ў гэтых спаборніцтвах заняў амерыканец Скот Хофман (5 м 70 см). Такі ж вынік паказалі яшчэ два лёгкаатлеты — Васіль Булка і Ігар Грандзянкоў. Яны падзялілі трэцяе месца.

Нагадаем, што апошні рэкорд, які ўстанавіў Сяргей Бубка 21 лютага ў Берліне,— 6 м 13 см.

ФУТБОЛ

Каманда маскоўскага «Спартака», якая рыхтуецца да чэмпіяната Расіі, прайграла ў Італіі сяброўскі матч камандзе другога дывізіёна «Піза» з лікам 1:2.

«Дынама» (Масква), якое таксама зараз у Італіі, згуляла ўнічыю (1:1) з «Касенцай»— клубам другога дывізіёна чэмпіяната Італіі.

ШАХМАТЫ

У дзевятым туры міжнароднага турніра, які праходзіць у іспанскім горадзе Лінарэсе, Гары Каспараў і Аляксандр Бяляўскі згулялі ўнічыю і працягваюць лідзіраваць (6,5 і 6 ачкоў).

Партыя паміж прадстаўніком Беларусі Барысам Гельфандам і Любамірам Любоевічам з Югаславіі адкладзена. Услед за двума лідэрамі ідуць: Карпаў — 5,5 ачка, Іванчук, Ільескас і Цімман — па 5, Анад — 4,5, Гельфанд — 4, Барзеў, Салаў і Юсупаў — па 4, Шорт — 3,5, Спілмэн — 3 і Любаевіч — 2.

ГАНДБОЛ

Шэсць каманд прадоўжаць барацьбу за ўзнагароды. З 24 па 29 сакавіка ў Краснадары сустрэнуцца «Дынама» (Астрахань), СКА (Мінск), ЦСКА, СКІ (Краснадар), «Нява» (Санкт-Пецярбург) і «Каўсцік» (Валгаград).

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту М. Грушэўскага

НАШЫ КОНКУРСЫ

Працягваем рэспубліканскія конкурсы рашэнняў па рускіх і міжнародных шашках, а таксама рашэнняў, складання і ацэнак казачных (шашачна-шахматных) задач.

А зараз прапануем чацвёртыя заданні:

РУСКІЯ ШАШКІ

Конкурс № 92

Канстанцін Тарасевіч (Бярозаўскі р-н)

Белыя: дамкі а3, а7, d6, f6, h4, простыя с3, е5, е7, f2(9).

Чорныя: дамка f8, простыя а5, h6(3).

Белыя пачынаюць і запіраюць даве простыя чорныя (два ачкі).

МІЖНАРОДНЫЯ ШАШКІ

Конкурс № 54

Пётр Шкладаў (г. Наваполацк)

Белыя: простыя 24, 30, 38, 39, 40, 41, 42(7).

Чорныя: простыя 8, 9, 13, 17, 27, 28, 36(7).

Ход і выйгрыш белых (два ачкі).

ШАШКІ + ШАХМАТЫ

Конкурс № 3

Уладзімір Сапжынскі (г. Рагачоў)

Белыя: слон d6, конь е6, пешка е5, дамка с7, простыя в4, f4(6).

Чорныя: простыя в8, f8(2).

Белыя пачынаюць і запіраюць даве простыя чорныя (адно ачко).

Чакаем вашых адказаў, а таксама ацэнкі гэтай казачнай задачы (ад 0 да 10 ачкоў па зместу).

ВЫНІКІ КОНКУРСУ

Паведамляем вынікі 1-га рэспубліканскага конкурсу па шашачна-шахматнай кампазіцыі: **І. П. Шкладаў** (задача № 28) — 6 ачкоў, **2—3. А. Акуліч, І. Наўроцкі** (задачы 36 і 1) — па 5,5 ачка, **4—7 І. Наўроцкі, П. Шкладаў** (задачы 2, 27, 30, 24) — па 5 ачкоў, **8—11. П. Шкладаў, Г. Дымпер** (задачы 21, 34, 9, 33) — па 4,5 ачка, **12—16. П. Шкладаў, Г. Дымпер** (задачы 7, 4, 10, 8, 6) — па 4 ачкі, **17—18. М. Грушэўскі** (задачы 23 і 32) — па 3,5 ачка, **19—20 М. Грушэўскі** (задачы 11 і 20) — па 3 ачкі, **21—23. М. Грушэўскі, П. Шкладаў, В. Шульга** (задачы 5, 19, 35) — па 2,5 ачка, **24—27. П. Шкладаў, М. Грушэўскі, П. Шкладаў** (задачы 31, 17, 18 і 14) — па два ачкі.

Першыя тры прызёры будуць адзначаны.

Гэта паведамленне адначасова з'яўляецца даведкай, што П. Шкладаў, А. Акуліч і І. Наўроцкі зарабілі па аднаму класіфікацыйнаму балу для прысвоєння адпаведнага звання па кампазіцыі.

Я студзеня мы апублікавалі вынікі гэтага конкурсу сярод рашальнікаў і суддзяў.

Калектыў рэдакцыі газеты «Звязда» выказвае глыбокае спачуванне супрацоўніцы газеты В. М. Стальмаховай з выпадку напаткаўшага яе вялікага гора—смерці МАЦІ.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

10 сакавіка

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Вузельчыкі памяці». Кінанарыс.
9.00. Гісторыя Беларусі. 8 клас.
9.35. Процістаянне.
10.40. «Ад і да».
10.55. Тэлевізійны Дом кіно.
15.25. «Людзі на балоце. Палеская хроніка». 1-я серыя. «На ростанях».
16.35. Гісторыя Беларусі. 9 клас.
17.05. Канцэрт выхаванцаў і настаўнікаў школ рэспублікі, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння Р. Р. Шырмы.
18.00. Дак. фільмы.
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Віцебск).
19.35. Наш каментарый.
19.40. Эканамічная хваля. У перапынку (20.25) — Калыханка.
21.00. Тэлебіржа.
21.15. Актуальнае інтэрв'ю. Праблемы вышэйшай школы.
21.35. «Панемні з Вілька». Маст. фільм.
23.25. НІКа.

І канал. Астанкіна

5.00. Раніца.
7.35. «Воўк і сямёра казлянят». Мультфільм.
7.45. Канцэрт.
8.30. Маст. фільм «Гульня з агнём». 1-я серыя.
9.45. Радыяцыйны кантроль і бяспека.
10.05. Фермата.
10.35. Футбольны агляд.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.25. Чэмпіянат і Кубак СНД па спартыўнай гімнастыцы.
13.25. Блакнот.
13.30. «Вам гэта трэба?»
13.45. Гандлёвы рад.
14.00. Навіны.
14.25. Урокі Вольгі Івановай.
14.40. «Поэза ў суд». Маст. фільм. 2-я серыя.
15.55. Дзіцячы музычны клуб.
16.40. «Наваселле ў братні Труса». Мультфільм.
17.00. Навіны.
17.20. І. С. Бах. «Брандэнбургскі канцэрт» № 6.
17.40. «Тэма».
18.25. Маст. фільм «Гульня з агнём». 1-я серыя.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Тэлевізійнае знаёмства. Урмас От гутарыць з Лехам Валенсам.
21.40. Фермата.
22.10. «Акно ў Еўропу».
22.20. Хакей. «Дынамо» (Масква) — «Хімік».
23.00. Навіны.
23.25. Матч на званне чэмпіёна свету па кік-боксінгу.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Французская мова. 1-ы год навучання.
7.50. Вольны час. «Дай лапу, сябар!»
8.05. Французская мова. 2-гі год навучання.
8.35. Дзіцячая гадзіна (з урокам французскай мовы).
9.35. «Цішыня № 9».
10.45. Мультфільм.
10.55. Пятае кола.
12.40. «Парады пчалярам».
13.00. Весткі.
15.00. Трансрасэфір: «Каўказрэвю».
15.45. «Прастора плюс».
16.15. «Вялікі Талкай — сяло мардоўскае».
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. Хрысціянская праграма.
17.30. Вольны час. «Пад знакам Рыбы».
17.45. Парламенцкі веснік Расіі.
18.00. «Пасланнік неба». Дак. фільм.
18.45. «Адна ноч у Берліне».
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Смешныя гісторыі. «Сам сабе рэжысёр».
20.00. Галіводскі парад зорак.
20.50. «Люстэркі».
21.20. «Ліквідэ для мудрацоў».
22.00. Весткі.
22.25. Грамадская думка.
22.35. «Аўта-шоў».

11 сакавіка

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Птушкі на гнёздах». Кінанарыс.
9.00. Гісторыя Беларусі. 9 клас.
9.30. «Усё пра цябе». Фільм-канцэрт.
10.00. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.
16.30. «Людзі на балоце. Палеская хроніка». 2-я серыя «Спякота».
17.40. «Падушка для сонейка», «Асцярожна! Карасі!» Мультфільмы.
18.00. Дак. фільмы.
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Гомель).
19.35. Наш каментарый. «Цывільнае жыццё джы-ай».
19.40. Зваротная сувязь.
20.25. Калыханка.
20.45. Гандаль-дайджэст.
21.00. «Свецік». Маст. фільм.
22.15. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння — НІКа.

І канал. Астанкіна

5.00. Раніца.
7.35. «Самы вучоны заяц». Мультфільм.
7.50. Дзіцячы музычны клуб.
8.35. Маст. фільм «Гульня з агнём». 2-я серыя.
10.10. Харэаграфічныя кампазіцыі К. Галяйзоўскага.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.25. «Г. Дарэ. Жыццё ў мастацтве».
12.15. Інстытут чалавека.
12.55. Як дабіцца поспеху.
13.15. Тэлемікст.
14.00. Навіны.
14.25. Сёння і тады.
14.55. «Арэвік». Маст. фільм. 1-я серыя.
16.00. «Прыгоды Чока і Бока». Мультфільм.
17.00. Навіны.
17.20. Дак. фільм «Вывай, дыктатура!»
18.10. Маст. фільм «Гульня з агнём». 2-я серыя.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. «Чорная скрыня».
21.20. Канцэрт З. Саткілавы.
22.20. Хакей. ЦСКА — «Крылы Савета».
23.00. Навіны.
23.25. Музычны прагноз.
23.55. Таэквандо. Міжнародны турнір.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Нямецкая мова. 1-ы год навучання.
7.50. Вольны час. «Пад знакам Рыбы».
8.05. Нямецкая мова. 2-гі год навучання.
8.35. «К-2» прадстаўляе...
11.50. «Падтрымліваць агонь».
12.20. «Мяне выдалі на паверхню».
13.00. Весткі.
15.00. Дзіцячая гадзіна (з урокам англійскай мовы).
16.00. Школа менеджэраў.
16.30. Восень жыцця.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. Трансрасэфір: «У адным паляўнічым угоддзі».
17.45. Вольны час. «Дай лапу, сябар!»
18.00. Азы кар'еры. «Фірма «Стыплер».
18.15. «Рэйс з грузам 200».
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Тварам да Расіі.
19.50. Мультфільм.
20.00. На сесіі ВС Расійскай Федэрацыі.
20.30. Кароткаметражныя фільмы «Аркестр прайшоў па нашай вуліцы», «Канец гульні».
21.00. Тэле-прэс. З удзелам старшыні Канстытуцыйнага суда Расійскай Федэрацыі В. Д. Зоркіна.
22.00. Весткі.
22.20. Тэатральны раз'езд. «Іранічная кампанія» з Пермі.
22.55. Экзотыка.

НА ДВОР'Е

10 сакавіка

Сёння ўдзень па рэспубліцы пераменная воблачнасць без ападкаў. Тэмпература паветра ў Брэсце — 11—13, Гродна — 9—11, Гомелі, Мінску і Магілёве — 8—10, Віцебску — 7—9 градусаў цепла. У наступныя дзвое сутак: 11 сакавіка характар надвор'я істотна не зменіцца, 12-га пройдуць невялікія дажджы.

Л. САНКЕВІЧ, інжынер-сінаптык.

СОВЕТСКАЯ БЕЛОРУССИЯ — СЁННЯ Ў НУМАРЫ

«Вясна ідзе, вясне дарогу. На палях Піншчыны пачалася сяўба яравых.

Напярэдадні падзеі, якой не будзе. **«Армія не выйдзе на плошчу. Нават без зброі...»**

Пастанова СМ РБ аб выказе з рэспублік ў гатым годзе прадукцыі ў абмен на камплектуючыя вырабы, паўфабрыкаты, сыравіну і матэрыялы для патрэб вытворчасці.

Пункт погляду. **«Дом са сваяк не пабудаваць»** — артыкул кандыдата філасофскіх навук В. Вялічкі.

Па пісьму ў рэдакцыю. **«Канфрантацыя».**

«Зялёная аптэка».

«Мая сучасніца». Тэматычная старонка.

РАДЫЁ

11 сакавіка

Апошнія паведамленні: 6.00, 7.00, 15.00, 20.00, 23.00.

7.00 — «Радыёфакт». 8.05 — «У Савеце Міністраў рэспублікі. Урадавая прэс-служба паведамляе». 8.15 — «Дзелавы веснік: эканоміка і палітыка». 9.15 —«Тайны Крошынскага парку». Перадача 1-я. 10.00—адкрыццё сесіі Вярхоўнага Савета Беларусі. 12.10 — «Ці атрымаем зямлю?». 12.30 — на сесіі Вярхоўнага Савета Беларусі. 14.00 —канцэрт. 15.15 — «Прывітанне з Францыі». 16.00—на сесіі Вярхоўнага Савета Беларусі. 18.00—перадачы абласнога радыё. 19.00 — гуманітарна-інфармацыйны канал радыёстанцыі «Беларуская маладзёжная». 19.45 — вячэрняя казка. 20.00— «Дзень нашага жыцця». 20.25— А. Кудравец. «Жанчыны». Інсцэніраванае апавяданне. 22.30 —канцэрт. 23.10 — гуманітарна-інфармацыйны канал радыёстанцыі «Беларуская маладзёжная».

«СПОРТЛАТО»
Вынікі 10 тыражу.
«6 з 45»:
5, 43, 34, 3, 24, 36.
«5 з 36»:
33, 28, 23, 36, 34.

МП «Паслуга» купіць САЛЁНУЮ СКУРСЫРАВІНУ буйной рагатай жывёлы.
ЧАКАЕМ ПРАПАНОЎ ПА ТЭЛ. У МІНСКУ
27-16-92 (з 9.00 да 17.00),
70-34-78 (пасля 18.00).

Галоўны рэдактар У. Б. НАРКЕВІЧ.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, калектыў рэдакцыі газеты «Звязда».

НАШ АДРАС: 220041, гор. Мінск, праспект Ф. Скарыны, 77, рэдакцыя газеты «Звязда».

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная — 32-51-05, аддзела пісьмаў—32-04-52, 32-41-92, навін—32-15-02, даведкі па рэкламе і аб'явах — 32-35-91.

ПА НУМАРУ ДЗЯЖУРЫЛІ: член рэдакцыйнай калегіі Яраслаў Чапля, намеснік адказнага сакратара Яўген Ляхаў, старшы карэктар Ала Сабалеўская.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.

Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з чытачамі.

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку». Тыраж 81.784. Індэкс 63.850. Зак. № 50. Выходзіць 250 разоў на год. Нумар падпісаны ў 21.05.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12